Пролетарыи всех стран, соединяйтесь! פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער פאַראייניקט זיך! Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się! Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся.

УМОВЫ ПАДПІСКІ: На 1 м-ц—90 к.; на 3 м-цы—2 р. 60 к. на 6 м-цаў—5 р.; на 1 год—9 р. 75 к. Змена адрасу: мясцовага—10 к., іншагароднага—20 кап. Падпіска і абвесткі прымаюцца: У Гал. Канторы 63, трэці паверх, ад 9 гадз. раніцы да 3-х гадз. дня. Бел. Дзярж. Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. кан.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нонпарэлі (пасьля тэксту) 50 к. Масквы і Ленінграда. Пры... Згодна... бярэцца...

РЭДАКЦЫЯ—Г. МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральн. Камітэту камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Мен. АК КП(б)Б.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎН. КАНТОРА. 1) Рэдактар прымае ад 11—1 гадз. дня: тэлефон № 10-74. 2) Сакратар рэдакцыі—ад 12 да 2-ое гадзіны дня, тэл. № 6-19. 3) Пачты рэдактар (друкарня) ад 6 гадз. вач. тэл. № 6-42. Кіраўн. Гал. Канторай Канторы абвестак і падпіскі } тэл. № 781.

ПЯТНІЦА, 6 СТУДЗЕНЯ 1928 г. № 5 (2812). Кошт асобнага нумару ўсюды 5 кап.

Год выданьня дванаццаты.

...Пастера 13, Одесской Государственной Публичной Библиотеке

Абвяшчэньне.

Сёньня, а 6 гадзіне вечары, у клюбе Карла Маркса (зрыцельная заля) адбудзецца

адчыненьне II сэсіі ЦВК БССР.

ПАРАДАК ДНЯ СЭСІІ:

1. Бюджэт БССР на 1927-28 г. (даклад СНК і садаклад бюджэтнае камісіі ЦВК БССР).
2. Становішча і далейшыя пэрспэктывы разьвіцьця народнае гаспадаркі БССР (дакл. т. Галадзед).
3. Аб сыстэме народнае асьветы (дакл. т. Баліцкі).
4. Рацыяналізацыя савецкага апарату і задачы яго ўзмацненьня (дакл. т. Калнін).
5. Зьмены ў складзе ўраду БССР (дакл. т. Хацкевіч).
6. Зацьверджаньне законаў, прынятых паміж першай і другой сэсіямі ЦВК БССР (дакл. т. Хацкевіч).

Сакратар ЦВК БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

АБВЯШЧЭНЬНЕ.

Сёньня, 6-га студзеня, а 5 гадзіне ўвечары, у клюбе Карла Маркса (зрыцельная заля) адбудзецца

ПАСЯДЖЭНЬНЕ ФРАКЦЫІ КП(б)Б II-й СЭСІІ ЦВК БССР.

Адказны сакратар фракцыі КП(б)Б Прэзыдыуму ЦВК БССР А. Хацкевіч.

Сэсія ЦВК БССР.

Сёньня начынае сваю работу чарговая (другая) сэсія ЦВК БССР восьмага скліканьня. Вышэйшы орган савецкае ўлады на Беларусі абмяркуе і вырашыць па дакладах ураду рад важнейшых пытаньняў гаспадарчага і культурнага будаўніцтва ў нашай краіне.

На першым месцы стаіць пытаньне аб бюджэце БССР на 1927-28 гаспадарчы год.

Наш бюджэт расьце з году ў год. Гэта—лепшы доказ няўхільнага ўздыму нашае народнае гаспадаркі.

Зьяўляючыся магутным сродкам разьмеркаваньня народнага прыбытку, бюджэт дзяржаўны і мясцовы ўсё больш павялічваюць сваю ролю ва ўсім нашым сацыялістычным будаўніцтве.

Бюджэт, які прадстаўляецца сэсіі, у параўнаньні з мінулым годам узрастае: дзяржаўны—на 28,8 проц. і мясцовы—на 9,3 проц.

Асноўныя выдаткі бюджэту прыпадаюць на народную гаспадарку і сацыяльна-культурнае будаўніцтва, г. зн. поўнасьцю адпавядаюць генэральнай лініі сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне.

Далей, сэсія разгледзіць пытаньні, зьвязаныя з пяцігадовым плянам разьвіцьця народнае гаспадаркі БССР.

Плянаваньць, гэта асноўная ўмова посьпеху сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне, заваёўвае сабе ўсё большае і большае месца ва ўсёй нашай рабоце. У пэрспэктыўных плянах, прадстаўляемых сэсіі, лінія на індустрыялізацыю нашае краіны і на інтэнсыфікацыю нашае сельскае гаспадаркі знайшла свой досыць яскравы адбітак.

Так, адных капітальных укладаньняў у нашу прамысловасьць за бліжэйшае пяцігодзьдзе прадугледжваецца зрабіць на 126 мільёнаў рублёў; у сельскую гаспадарку за гэты-ж тэрмін будзе ўложана прыблізна 89,6 мільён. рублёў.

У адпаведнасьці з гэтымі ўкладаньнямі ў прамысловасьць, удзельная вага апошняй ва ўсёй нашай гаспадарцы ўзьнімецца з 13,3 проц. у 1925-26 г. да 26,3 проц. да канца апошняга году пяцігодкі (1931-32 г.).

Гэты ўздым прамысловасьці выкліча рост рабочае сілы за гэты-ж тэрмін на 42,2 проц. Зьніжэньне сабекошту прамысловай прадукцыі на пяцігодцы дасягне 17 проц., а адпускных цэн—на 20 проц. Валавая прадукцыя сельскае гаспадаркі паводле пяцігадовага пляну вырасьце на 33,4 проц.

З гэтых лічбаў, атрыманых у выніку вялікай і сур'ёзнай работы, выкананай нашымі плянуючымі органамі, ясна відаць, куды ідзе разьвіцьцё нашае краіны. Разам з усім СССР, наша БССР ідзе шпарка па шляху ўздыму народнае гаспадаркі, па шляху палепшаньня становішча рабочых і сялян, па шляху да сацыялізму.

Наступнае пытаньне сэсіі—аб сыстэме народнае асьветы. У наш час, калі пытаньні культурнай рэвалюцыі набываюць першачарговае значэньне, настаноўка гэтага пытаньня на сэсіі надзвычайна неабходна. Гэтае пытаньне пастаўлена ў парадку папярэдняга абгаварэньня з тым, каб потым усе матар'ялы аб сыстэме народнае асьветы былі разасланы на месцы, на шырокае абгаварэньне рабочых і сялян.

У гэтым напрамку мы маем ужо практыку з кодэксам аб шлюбе і сям'і. Абмеркаваньне яго ў масах дало надзвычай шмат каштоўнага. Чэрпаючы гэтае, што такое важнае пытаньне, як пытаньне аб сыстэме народнае асьветы, выкліча да сябе надзвычайную ўвагу рабочых і сялян.

На чарговым зьезьдзе саветаў, ці нават на наступнай сэсіі, улічыўшы ўсе напраўкі ў часе гэтай шырокай дыскусіі, можна будзе ўжо канчаткова зацьверджаць гэту сыстэму.

Пытаньне аб рацыяналізацыі і палепшаньні нашага савецкага апарату, пытаньне, якому такую ўвагу аддаў XV зьезд нашае партыі па дакладу т. Арджанікідзе, таксама стаіць на парадку дня сэсіі.

Урадам уносіцца на сэсію цэлы рад прапаўскага на гэтыя пытаньні, якія маюць на мэце патананьне апарату, яго набліжэньне да мас рабочых і сялян.

Зразумела, законам, які прыме сэсія на гэтым пункце парадку дня, пытаньне аб працягу барацьбы за палепшаньне дзяржаўнага апарату ня здымецца. Гэту работу, гэту барацьбу трэба будзе праводзіць і надалей.

Што даў Эўропе 1927 год.

Ліга Нацый зноў паказала сваё бясьсільле.

Францыя імкнецца да згоды з СССР.

БЭРЛІН, 1. Падагульваючы вынікі замежна-палітычных адносін Нямеччыны за 1927 год, афіцыёзнае выданьне «Дойчэ Дыплёматышэ Палітышэ Карэспандэнт» да станоўчых зьявішч у галіне замежнае палітыкі Нямеччыны за мінулы год адносіць канчатковае скасаваньне міжсаюзьніцкага ваеннага кантролю ў Нямеччыне і зьмяншэньне ліку акупацыйных армій у Рэйнскай вобласьці на 10.000 чалавек.

У пасыў мінулага году газэта «запісвае» значную правалочку ў справе разьвіцьця палітыкі, пачатай у «Лёкарно» і «Туары», а так сама і тыя абставіны, што праблема, так званага, агульнага ўрагуляваньня спрэчных пытаньняў паміж Нямеччынай і Францыяй і, у першую чаргу, праблема раброеньня пасунулася, у параўнаньні з пачаткам мінулага году, вельмі нязначна.

У працівагу гэтай афіцыёзнай ацэнцы, прэса нацыяналістых лічыць вынікі мінулага году для Нямеччыны ў галіне замежнае палітыкі далёкам амоўнымі. Прэса нацыяналістых ва начае, *што Ліга Нацый за мінулы год яшчэ раз даказала сваё поўнае бясьсільле вырашыць важнейшыя пытаньні міжнароднай палітыкі, ня кажучы ўжо аб яе бясьсільлі ў пытаньні аб разброеньні.* Ня гледячы на тое, што ў Лігу Нацый увайшла Нямеччына, Ліга па сутнасьці, як і раней, заставалася ў працягу мінулага году зброяй для захаваньня версальскае згоды.

Што датычыць агульнага міжнароднага становішча, дык нямецкі друк з асаблівай падрабязнасьцю спыняецца на англа-савецкім разрыве.

Друк канстатуе, што ангельскі плян адзінага антысавецкага фронту пацярпеў крушэньне. Асабліва настойліва падкрэсьліваецца гэта ў «Крэйц-Цэйтунг». Газэта зазначае, што Францыя не пайшла ў гэтых адносінах за Англіяй і, наадварот, імкнецца да згоды з Масквою. Калі гэта згода будзе ажыцьцёўлена, дык яна, паводле слоў газэты, зробіць вялізны ўплыў на агульнае становішча спраў ва Ўсходняй Эўропе.

Амэрыка ня згодна падпісаць угавор аб ненападзе.

ВАШЫНГТОН, 5. У адказ на прапанову Брыяна ўтварыць угавор між Францыяй і П.-А. З. Ш. аб узаемным адмаўленьні ад вайны, як сродку вырашэньня міжнародных канфліктаў, міністр замежных спраў Келёг заявіў, што ня згодзен на падпісаньне такога ўгавору і прапанаваў прыцягнуць да ўдзелу ў ім рад краін. Адначасова Келёг пераслаў Брыяну праект арбітражнага ўгавору між Францыяй і П.-А. З. Ш., зусім абасобленага ад праекту ўгавору аб адмаўленьні ад вайны.

Пад указку Чэмбэрлена.

ВЕНА, 4. Па дагатковых зьвестках Белграду, міністр замежных спраў Марынковіч у сваім выступленьні на пасяджэньні фінансавай камісіі парляманту аб адносінах паміж Юга-Славіяй і СССР між іншым заявіў:

— Як відома, савецка-ангельскія ўзаемаадносіны нездавальняючыя. Устанаўленьне прыяцельскіх адносін паміж Юга-Славіяй і СССР пагоршылі-б адносіны Юга-Славіі з Англіяй.

250.000 ангельскіх тэкстыльшчыкаў рых туюць адпор прадпрыемцам.

ЛЁНДАН, 5. У Манчэсьцеры пасяджэньне рады аб'яднанага саюзу тэкстыльшчыкаў, які налічвае 250.000 рабочых, ухваліла рэзалюцыю, у якой заяўляе, што ўсякая спроба прадпрыемцаў зьнізіць заработак або павялічыць даўжыню працоўнага дня выкліча аб'яднань адпор усіх зацікаўленых прафсаюзаў.

Італьянскія кулямёты ў Польшчу праз Вэнгрыю.

Чэха-славацкі друк пратэстуе.

ПРАГА, 4. Большасьць чэха-славацкіх газэт, у зьвязку з спробаю нелегальнага правозу італьянскіх кулямётаў праз Вэнгрыю ў Польшчу, рэзка нападае на Вэнгрыю, зазначаючы на грубыя парушэньні Вэнгрыяй мірнага дагавору.

Газэты патрабуюць „дыпляматычнага ўмяшаньня" ў гэту справу.

У зьвязку з гэтым паміж урадамі краін Малой Антанты адбываецца абмен думкамі, які пакуль што незакончан.

Замятаюць сьляды.

ВЕНА, 4. Паводле паведамленьня венскае «Абэнд», у апошнія два дні прадстаўнікі ўсіх дзяржаў, па даручэньні сваіх урадаў, наведалі кіраўніцтва саюзнага канцлера і запыталіся тлумачэньняў адносна інцыдэнту ў Сант-Татарзе, у зьвязку з правозам італьянскае зброі.

З афіцыйных крыніц карэспандэнту «ТАСС» паведамілі, што крокі, ужытыя прадстаўнікамі замежных дзяржаў, мелі выключна інфармацыйны характар.

Посьпехі савецкага гандлю.

Савецка-японскі гандаль.

ТОКІЁ, 4. Усе японскія газэты агалашаюць новагоднюю гутарку гандлёвага прадстаўніка СССР Анікеева з прадстаўнікамі друку.

Анікеў падкрэсьлівае масьлянховае разьвіцьцё савецка-японскага гандлю і Камісійный дзейнасьці японскіх фірм у СССР і выказвае надзею на падпісаньне ў бліжэйшы час рыбалоўнае канвэнцыі, што падрыхтуе шлях да заключэньня савецка-японскага гандлёвага ўгавору.

Савецкая нафта ў Англіі.

ЛЁНДАН, 4. Многія ангельскія газэты друкуюць інтэрв'ю тав. Фрыдмана, намесьніка старшыні праўленьня Нафтасиндыкату.

Тав. Фрыдман заявіў, што хоць увоз савецкае нафты ў Англію ў пралку 1927 г. зьменшыўся, тым ня менш зварот таварыства на продаж савецкіх нафтавых прадуктаў у Англіі (РОП'у) павялічыўся на 52 проц., што дало магчымасьць ліквідаваць значную частку запасаў „РОП'у" у Англіі.

Тав. Фрыдман далей заявіў:

«Савецкі ўвоз у Англію ані не падарпеў у выніку нападак «Дэйлі Мэйль».

Тав. Крэсьцінскі ў Гамбурзе.

БЭРЛІН, 5. Пасол СССР т. Крэсьцінскі, які знаходзіцца ў Гамбурзе, наладзіў прыём, на якім прысутнічалі бургамістр Гамбурга, прамысці пасол у Рызе і шматлікія прадстаўнікі прамысловых, гандлёвых і банкоўскіх колаў Гамбурга.

У часе прыёму абмяркоўваліся пытаньні гаспадарчае і культурнага разьвіцьця СССР, магчымасьці навукоўга і знаёмачнага супрацоўніцтва СССР і Нямеччыны.

Пажар з людзкімі ахвярамі ў Бэрліне.

БЭРЛІН, 5. 4-га ўначы ў пакаўальным памяшканьні аднаго дому на адной з вуліц Бэрліну здарыўся моцны выбух, у выніку якога завалілася бакавая сьцяна дому.

Ад выбуху вынік пажар. Шматлікія пажарныя каманды, якія прыбылі на месца выбуху, да позьняй другое былі заняты гашэньнем пажару. Шмат забітых, 10 чалавек цяжка паранены. Дакладныя лічбы забітых невядома, бо многія трупы яшчэ ня выцягнуты з-пад абломкаў.

Два гады турмы за газэтныя артыкулы.

ПАРЫЖ, 4. За 9 артыкулаў, агалошаных у „Юманіта", у зьвязку з кампаніяй супроць мілітарызму, камуністы Гэйн прысуджан да двух год турмы і 4 тыс. франкаў штрафу, камуністы Сэнэрэ да 3 месяцаў і 200 франкаў штрафу.

Разводзьдзе ў Англіі.

ЛЁНДАН, 4. Уздым вады ў рэках Англіі ў зьвязку з вялікім сьнегападам дасяг максымальнага за апошнія 10 год узроўню. 3-га студзеня вада ў Тэмзе прыбывала кожную гадзіну на цалю; большая частка рэчышча Тэмзы заліта водою.

У Кінгстоне 5 барж сарваны з прычалаў струменем вады. Баржы пацягнулі за сабою яшчэ некалькі суднаў, што сталі ніжэй па рацэ. Уся група суднаў разьбілася аб мост. Дзьве вёскі з насельніцтвам у 2.000 чалавек кожная зусім адрэзаны ад сьвету.

НАЧНОЕ РАДЫЁ.

Барацьба з партызанамі Сандзіно.

НЬЮ-ЁРК, 5. Урад усё посылае новыя вайсковыя часьці проці партызанаў Сандзіно—правадыра Нікарагуаскіх лібералаў. Сёньня дадзен загад аб адпраўцы у Нікарагуа 5 крэйсэраў і аднаго баявога карабля. У атрадзе Сандзіно налічваецца 1000 чал. партызанаў, яны добра абучаны ваеннай справе і займаюць непрыступнае месца ў горах.

Забастоўка партовых рабочых у Нікарагуа.

НЬЮ-ЁРК, 5. У Нікарагуа забаставалі рабочыя докаў у парту Корэо. Урад Нікарагуа паслаў у порт войска і штрэйкбрэхераў.

У Бамбеі бастуюць 15.000 рабочых тэкстыльшчыкаў.

ЛЁНДАН, 5. Як паведамляюць з Бамбея, у сучасны момант бастуюць 6 тэкстыльных прадпрыемстваў з ліком каля 15.000 рабочых.

1000 рабочых выкінуты на вуліцу.

ЛЁНДАН, 5. У вугольным раёне Віган закрыліся дзьве вугольныя шахты. 1000 рабочых, якія працавалі ў гэтых шахтах, засталіся без работы.

Забастоўка тэкстыльшчыкаў у Ханькоу.

ШАНХАЙ, 5. У Ханькоу забаставалі рабочыя тэкстыльных прадпрыемстваў.

Італьянскія кулямёты пад арыштам.

ВЕНА, 5. Як паведамляюць з Будапешту, урадавы орган «Будапэшскі Хірлап» сьцьвярджае, што нелегальны правоз італьянскіх кулямётаў быў выяўлен не аўстрыйскімі мытнымі чыноўнікамі, а вэнгерскімі. Згодна паведамленьня газэты, вэнгерскі ўрад прапануе польскім адрасатам грузу зьявіцца за апошнім, каб вынесьніць сутнасьць справы. У працяўным выпадку, кулямёты будуць канфіскаваны і вынішчаны. Газэта «Рэч» адзначае, што Вэнгрыя відавочна рыхтуецца [illegible] тальны правоз зброі—ня ёсьць дзіва.

[illegible] абкораў пры рэд. „ЗЬВЯЗДА".

[illegible] 5-й гадзіне ўвечары (у памяшканьні рэд [illegible] 3-і паверх) адбудуцца заняткі рабкораўскіх [illegible] пры рэд. „ЗЬВЯЗДА".

ТЭМА:

[illegible] у насьценгазэтах

[illegible] «Зьвязды».

НАВІНЫ САВЕЦКАГА ДНЯ.

ПЕРАВЫБАРЫ САВЕТАЎ УВОСЕНЬ 1928 г.

ПАСТАНОВА ЦВК СССР.

МАСКВА, 5. Дзеля хадайніцтва асобных Саюзных Рэспублік аб частковым перанясеньні выбараў саветаў на розныя тэрміны 1928 году, а таксама ўзьнікаючае адсюль неабходнасьці ўстанавіць агульны для ўсяго СССР тэрмін правядзеньня выбарчае кампаніі, забясьпечваючы адначасовасьць яе, ЦВК СССР, у зьмену пастановы ад 19 лістапада 1927 г., пастанавіў прапанаваць ЦВК Саюзных Рэспублік перанесьці перавыбары саветаў, а таксама склік валасных (раённых), павятовых (акруговых), губэрскіх, абласных (краёвых), а таксама адпавядаючых ім зьездаў саветаў на восень 1928 г.

Маскоўскі партактыў ухваляе пастановы XV зьезду УсеКП(б).

МАСКВА. Сёньня адбыўся сход актыву Хамоўніцкага раёну, на якім прысутнічала 1.000 чалавек. У Краснапрэсьненскім, Замаскварэцкім, Сакольніцкім і Бауманаўскім раёнах адбыліся сходы ячэек. На актыве і ячэйках абгаворваліся вынікі 15-га зьезду УсеКП(б).

Усюды ўхвалены рэзалюцыі, у якіх адзначаецца правільнасьць пастаноў зьезду па ўсіх пытаньнях міжнароднай і ўнутранай палітыкі. Сходы з асаблівым здавальненьнем канстатуюць, што 15-ты зьезд канчаткова ліквідаваў трацкісцкую апазыцыю. Сходы заклікаюць усе ячэйкі да дакладнага вывучэньня пастаноў зьезду і правядзеньня іх у жыцьцё.

Пазыка ўмацаваньня сялянскае гаспадаркі.

МАСКВА, 5. Цэнтральны каапэрацыйны савет пастанавіў зьвярнуцца да ўсіх каапэрацыйных арганізацый СССР з прапановаю ўзяць актыўны ўдзел у кампаніі на распаўсюджаньні 100-мільённае пазыкі ўмацаваньня сялянскае гаспадаркі.

Каапэраваньне сялянства.

ТАМБОЎ, 5. Каапэрацыйны месячнік значна штурхнуў уперад справу каапэраваньня сялян. Згодна прыблізных даных, у працягу месячніка сельская спажывецкая каапэрацыя завербавала 17 тысяч новых пайшчыкаў і сабрала 43000 р. новых узносаў. Ня рэдкі выпадкі ўступленьня пайшчыкамі цэлых вёсак.

За сыстэматычныя зьдзекі.

КІЕЎ, 5. Акруговы суд прысудзіў да 4-х год зьняволеньня, без вараженьня ў правох, былога загадчыка місцэкім аддзяленьнем „Крэдыт-Бюро" Якуба Беларусца, абвінавачанага ў сыстэматычных зьдзеках над служачымі, сваяцтве, зваленьні супрацоўнікаў без ведама адпаведных органаў і г. д.

Сваім благім абыходжаньнем Беларусец давёў да самагубства двух супрацоўнікаў—Івасева і Фіша. У перадсьмертным лісьце Івасеў накінуў на Беларусца, як на вінаўніка сьмерці. Беларусец бескантрольна распараджаўся лёсам сваіх падначаленых, тэрарызаваў іх нагрозамі і хлусьлівымі даносамі, ня лічачыся ні з РСІ, ні з прафсаюзам.

Супрацоўнікі савецкага консульства ў Шанхаі зварочваюцца ў Маскву.

ЧЫТА, 4. Пасьпешным узадзівастоцкім цягніком праехаў у Маскву генэральны консул СССР в Шанхаі тав. Казлоўскі, гандлёвы прадстаўнік тав. Сарокін і іншыя працаўнікі консульства і гандлёвага прадстаўніцтва разам з сем'ямі.

З сялян—у навуковыя работнікі.

ХАРКАЎ, 4. Прэзыдыум ЦВК Украіны, па хадайніцтву НК аховы здароўя, прафесыянальных і навуковых арганізацый, узнагародзіў за навуковыя заслугі ордэнам працоўнага чырвонага сьцягу старшага прэпаратара Харкаўскага Бактэрыялёгічнага Інстытуту таварыша С. С. Нарубенка.

Нарубенка—селянін 20-ці год прыйшоў з вёскі ў Харкаў, дзе паступіў простым служачым у бактэрыялёгічны інстытут. Хутка ён высунуўся, як працаўнік, які мае, як прывялі мясцовыя вучоныя, высокую лябараторную тэхніку.

Ён вынайшоў рад каштоўных лябараторных прыборaў. Падрыхтаваньня Нарубенка экспанаты атрымалі першыя прэміі на міжнародным выстаўцы ў Дрэздэне.

Замерз настаўнік.

МАСКВА, 5. ЦСУ СССР атрымала паведамленьне аб тым, што настаўнік Пісараў, які варочаўся ўначы з важнае нарады на правядзеньні школьнага перапісу ў Гончынскай волясьці, Камышэрскага павету, зьбіўся з шляху і замёрз недалёка ад вёскі Меморыкінае.

Да забойства італьянскага віцэ-консула.

АДЭСА, 4. Акруговы пракурор тав. Штэйнберскі паведаміў карэспандэнту „Ратау" наступнае:

„Шуканьне забойцаў італьянскага віцэ-консула Кацыё праводзіцца самым энэрґічным тэмпам. Згодна распараджэньня пракуратуры, арыштаваны ўвесь крымінальны элемент, які праживае ў раёне, дзе зроблена злачынства. Сабраны папярэдні дазнаньне матар'ял поўнасьцю ўстанавіў, што забойства зроблена з мэтаю абрабаваньня.

У нашых суседзяў.

Манархістыя перад выбарамі.

ВАРШАВА, 4. У Варшаве ў пазацы князя Эпуша Радзівіла праз колькі дзён пачынаецца нарада польскіх манархістых. Прадстаўнікі манархістых зьехаліся з усяго краю. Мэтай нарады была падгатоўка да выбараў назначэньне выбарчых намісараў і выбар кандыдатаў да сойму і сэнату.

Пяст" і хадэкі дагаварваюцца.

ВАРШАВА, 4. Як даносіць газэты перамаўленьне між Пястам (партыя польскіх кулакоў) і Хадэцыяй (шляхецкая партыя) прыходзіць к канцу. Па ўсіх важнейшых пытаньнях дойдзена да згоды, застаюцца дробныя тэхнічныя пытаньні. У зьвязку з гэтым мусіць адбыцца пасяджэньне цэнтральнага камітэту Пясту і Хадэцыі, дзе пастановы перамаўленьняў будуць акончальна зацьверджаны. Значыць мы стаіць перад агульным выбарчым фронтам двух найбуйнейшых правых партый.

Бундаўцы і выбары.

ВІЛЬНЯ, 4. Арганізаваўся выбарчы камітэт бунду Вільні і паволіц. Да гэтага часу яшчэ невядома ці бунд уступіць у які-небудзь з утвораных блёкаў, ці пойдзе на выбары з уласным сьпісам.

Канцэрты савецкага дзяржаўнага хору ў Латвіі.

РЫГА, 4. У латвійскай нацыянальнай оперы адбыўся першы канцэрт савецкага дзяржаўнага хору, які прайшоў з вялікаым посьпехам, пры пераўнаных аваціях усяе залі. Друк адзадушна дае высокую ацэнку канцэрту.

Газэта „Падзя Брыдзі" называе да сягненьні хору „зьдзіўляючымі" і лічыць, што ямы магчымы „толькі ў такой краіне, якая высока ставіць інтарэсы культуры".

Націск Англіі на Літву

ПАРЫЖ, 4. Парыская газэта «Тан» паведамляе, што прыехаўшыя адначасова ў Коўну пасланьнікі Англіі і Францыі наведалі прэм'ера Вальдэмараса, з якім мелі доўгую нараду ў пытаньні аб польска-літоўскіх адносінах.

Паводле весткі «Тан» з коўнскіх крыніц, ангельцы робяць націск на Літву з мэтаю дамагчыся ад апошняе хутчэйшае згоды з Польшчаю.

За захаваньне аблігацый на руках у працоўных.

(Да 1-га тыражу пазыкі індустрыялізацыі).

Першы тыраж пазыкі індустрыялізацыі адбудзецца ў Маскве 14-га студзеня. Перанясеньне тэрміну тыражу з 28-га сьнежня на 14-е студзеня здарылася выключна таму, што тэхнічна немагчыма было своечасова разасласьць і замацаваць аблігацыі, бо гэта першая буйная масавая пазыка, якая ахапіла да 6 мільёнаў дробных трымальнікаў і да таго-ж у сваёй асноўнай частцы рэалізавалася ў рассрочку. Што многім здавалася немагчымым рэалізаваць у такі кароткі тэрмін пазыку [illegible] аб ня [illegible]

Адно з першых месц у гэтай перамозе, канечна адноснае, займае наша БССР, у якой рэалізавана пазыкі індустрыялізацыі на 2.700 тысяч р. і выканана ўзятая на сябе кантрольная лічба на 135 процантаў, ахапіўшы да 65 проц. кольчаснага складу членаў прафсаюзаў пры сярэдняй суме на кожнага члена прафсаюзу ў 20 руб., што складае да 33 проц. месячнай зарплаты.

Неабходна зараз-жа пачаць работу вакол замацаваньня гэтай перамогі праз выстарчальнае растлу[illegible] ным трымальнікам [illegible]

Ноччу на крэсах*).

Ю. Стаховіч.

На тым баку—высокія дымячыя фабрычныя каміны; залатыя палі пшаніцы. Там—бальшавіцкая Украіна.

На гэтым баку—Вільня, Навагрудак, Бельск. Акраіны—„крэсы" (беларускія і украінскія землі пад Польшчаю).

* * *

У цёмную, бяз зораў ночку загаралися панскія маёнткі... Ляцяць іскры над цёмным лесам. З дымам пушчаюць шляхту—помста сялян за крыўды.

Аб чым апавядаюць гэтыя чырвоныя іскры, што ветрам разносяцца?—Пра вызарныя катаваньні.

Апавядаў Пічмпар Бартнічук: «Дэфэзіўчык (охранык) Кайдан загадаў зьняць з мяне боты і пачаў катаваць мяне электрычным токам. Калолі пяткі дротам, білі мяне скручаным дротам па пятках, потым распранулі і білі па голым целе. Электрычны ток быў гэткі моцны, што я тры разы траціў прытомнасьць. А памісар Кайдан казаў: —Загінеш, як собака!"...

Апавядаў Рыгор Зімніч з Кажангарадку: „Арыштавалі мяне і ўсю сям'ю. Лупчыка таксама і Антановіча з іншых. Закладалі патроны паміж пальцаў, выкручвалі рукі, пальцы засоўвалі між дзьвярмі, а дзьверы зачынялі".

Ятчэ: пасьцідзесяцігадовы Карп Іскра з Пружан.

—Мяне кідалі, як мячом з вугла ў вугал. Адзін жандар за другога. Я страціў прытомнасьць. Мяне аблілі вадою, кінулі на падлогу, выбілі шампалямі ў пяткі: „Устань, бальшавік, выліжы языком кроў",

І яшчэ адно апавяданьне—селяніна Шчарбінскага, аднаго з арыштаваных сямісот чалавек.

Семсот чалавек ператрог не зьмясьціў. Высялілі больніцу, ложкі проч выставілі: «Хамаў» пачнамі пасадзілі на 40-50 чалавек у самой у пяць метраў шырыні і ўдоўжкі.

—Шчарбінскі, на допыт...

Нагою штурхнулі ў цёмны пакой.

Пакалалі на падлозе, сьвязалі. Пад кінці засадзілі раскалёныя іголкі.

Шчарбінскі страціў прытомнасьць. Асьвяжылі вядром вады. Дофэвыўчык Шлюсаўчык шырока расьсеўся на крэсьле.—Налей вады ў бутэльку. Так, так. Стой чорт, налей газы.

Шлюсаўчык выпіваўся. Вылей усё, вады многа! Больш газы, не разумееш, ці што?..

Зразумелі. Ваду з газаю ўлілі бутэлькамі праз рот.

Потым у бутэльку мачу наллілі...

—Наёмка, пся крэў, ротам! Лей носам!..

Налілі праз нос. Жывот калуўся. На жывот соў паліцыйскі. Жоўтая вадкасьць хлынула з крывёю праз рот.

—Ра-аз, два-а!..

Агент Кавалоўскі кесэла задаволеную на жывоце лежачага.

—Ну, а зараз палівішан?..

Вочы Шчарбінскага наліліся крывёю. Ён зноў страціў прытомнасьць. Зноў водою аблілі. Шлюсаўчык запаліў новую папяроску і прыпякаў ёю губы Шчарбінскага.

—Ня скажаш? Убачыш... Пачакаем.

Зьвязалі яму ногі. Між ног прасунулі кій. Кій падняслі ўгару. Чалавек павіс галавою ўніз.

—Раз, два, ка-чай!

Кій закруціўся шырма. Чалавек за крутіўся. З вусноў хлынула кроў.

—Ха-ха-ха! Коля!..

* * *

Украінскі дэпутат вышаў на трыбуну. Разгарнуў блёкнот і пачаў сваю прамову. Казаў аб Бартнічуку. Апавядаў пра Зімніча. Прачытаў скаргу Шчарбінскага. Потым паглядзеў у залю. Вялікая, шырокая, убраная заля сойму. У кутку ўлева сядзець пяцёра камуністых. Яны пільна, з нахмуранымі брывамі сачаць за дэпутатам на трыбуне. Ятчэ поруч пара сялянскіх дэпутатаў. А ўправа, па-сярэдку, за даўгімі шпіграмі—белыя ручкі, высокія чыстыя каўнеры.

З-заду нехта зарагатаў. За ім другі, трэці...

— Ну што-ж, нічога новага не скажаце, пане дэпутат?..

Дэпутат на трыбуне страціў спакой.

— Вам ятчэ больш трэба? Мала гэтых катаваньняў і зьдзекаў!

Зазаду зноў нехта зарагатаў.

Дэпутат на трыбуне ня выцярпеў. Сьціскаючы нервова кулакі, ён зьвярнуўся тварам да лёжы міністраў.

— Пане міністр унутраных спраў, вы хіба нічога ня маеце адказаць на ўсё гэта?..

Міністр застаўся спакойным. Ён схаваў усьмешку пад вусамі і адказаў:

— Так, гэта ўсё правільна. Але дзяржава, панове, ня можа быць адказнаю*)...

Пераклад В. Л.

*) Усе паданыя факты навядомлены групаю сялян, якія ў кастрычніку 1925г. ўцякалі з польскае дэфэзывы на „крэсах".

Іх прозьвішчы: Саўчук Сы[illegible] ма, Сядун Вінцэсь, Бартасе[illegible] мер, Лавіцкі Уладзіслаў, Х[illegible] з Вольнага і Пружанскага

*) Глядзі „Зьвязды" № 3 (2810), праходзіць ка «Жандары з ПНС»

ЖЫЦЬЦЁ ПАРТЫІ.

Старыя памылкі паўтараюцца.

(Чырвона-слабадзкая райпартарганізацыя, Бабруйшчына).

У мінулых перавыбарчых кампаніях сельсаветаў, каапэрацыі, КСУ пры правядзеньні дапускаліся пасобныя памылкі, якія потым пры надагульненьні адзначаліся на нарадах як у акругкоме, так і ў самых райкомах, і здавалася, што яны ўжо больш не паўторацца пры правядзеньні гэтых кампаній у будучым. Але мы бачым на справе другое. Матар'ялы абсьледваньня Чырвона-слабодзкай райпартарганізацыі гаворыць, што гэтыя памылкі ёсьць і цяпер і заключаюцца яны ў наступным:

Чапліцкая ячэйка КП(б)Б па пытаньні аб кіраўніцтве выбарамі ў праўленьне Танежыцкага с.-г. таварыства пастанаўляе: «што справы, бач, там вельмі дрэнныя, вялікая запазычанасьць (каля 3.000 руб.) і што партыйцы туды працаваць ісьці ня хочуць, а таму адмовіцца ад выстаўленьня кандыдатаў і наогул ад кіраўніцтва выбарамі».

Вось вам у наяўнасьці поўнае выяўленьне сапраўднага хвасьцізму. У выніку ў праўленьне праходзіць былы эсэр.

У такім жа становішчы знаходзіцца і Семежаўская ячэйка КП(б)Б, якая пры падборы кандыдатаў праўленьня крэдытнага таварыства пастанавіла: «можа райком каго-небудзь прышле».

Акрамя гэтых памылак у партыйным кіраўніцтве перавыбарчымі кампаніямі ёсьць рад іншых памылак, асабліва па пытаньнях работы з беднатой. Тыя-ж ячэйкі вырашаюць так: «на што нам зьбіраць сходы беднаты перад выбарамі ў КСУ, калі мы можам зусім згаварыцца аб кандыдатурах з партыйцамі, камсамольцамі на самым выбарчым сходзе». (Чапліцкая ячэйка»).

А вось Семежаўская ячэйка вызначыла правесьці тры сходы беднаты, а правяла ўсяго 1. Неправедзеньне яшчэ двух сходаў яна так тлумачыць. «ведаеце, страшэнна няма калі і зусім часу не хапае». Бачыце на работу з беднатою ячэйцы не хапае часу і што з гэтага вышла...

На перавыбарах праўленьня спажывецкай каапэрацыі беднота сядзела маўкліва (бо ня было часу з ёю зачыцца і яе падрыхтаваць), а група заможных і кулакоў, нават нянайчыкаў каапэрацыі, крычала і зрывала сход і амаль яго не сарвала. Зразумела, крыкуном далі належны адпор. У праўленьне прайшлі належныя кандыдаты. Тут нявольна ўспамінаюцца словы тав. Сталіна на 14-м партзьезде: «зразумела няма нічога лягчэйшага ў барацьбе з кулакамі, як абаперціся на ДПУ, але гэта ня выхад. Трэба наадварот так выхаваць беднату і прыцягнуць серадняка, каб яны самі без усялякага ДПУ давалі адпор кулаком».

Вось аб гэтых словах вельмі часта забываюць партыйныя арганізацыі на мясцох.

Н. Вараб'ёў.

Пашыраем працу з беднатой.

(Мазырская акруга).

Карповіцкая ячэйка КП(б)Б па сваім колькасным складзе невялічкая, яна налічвае ўсяго 8 членаў і 2 кандыдаты партыі, але гэта не перашкаджала ячэйцы разгарнуць сваю работу па ўсіх галінах працы.

Ячэйка арганізавала падлік беднаты і батрацтва і наладзіла сярод іх плянавую работу. За час ад перавыбараў саветаў было праведзена 8 сходаў беднаты па пытаньнях с.-г. падатку, разьмеркаваньня лесу і г. д.

На лініі спажывецкай каапэрацыі каапэравана 183 бядняцкія гаспадаркі. Камітэтам узаемадапамогі было выдана 272 п. хлеба ў якасьці пазыкі. Ільгот на сельскагаспадарчым падатку атрымала 114 бядняцкіх гаспадарак і 91 гаспадарка атрымала ільготы па страхоўцы. Сярод беднаты разьмеркавана дармовага лесу на суму 50 руб.

Пад непасрэдным кіраўніцтвам ячэйкі працуе група беднаты пры сельскім савеце, якая за ўвесь час правяла 5 пасяджэньняў. На гэтых пасяджэньнях разглядаліся пытаньні аб пасеўнай кампаніі, разьмеркаваньні сенажаці, аб каапэраваньні беднаты, аб падліку аб'ектаў ападаткаваньня і г. д.

Дзякуючы ўзмацненьню работы сярод беднаты, апошняя значна згуртавалася вакол ячэйкі і сельскага савету.

Б. Шпітальнік.

Аб цэнтральным партыйным архіве.

(У парадку ўнясеньня прапановы).

Другая ўсебеларуская нарада архівістых, што адбывалася ў лютым 1927 г., канстатавала прыкмету плянавасьці ў савецкім архіўным будаўніцтве. Канстатавана, што ўмовы, створаныя савецкай уладай у архівным будаўніцтве, спрыяюць яго шпаркаму росквіту,—а гэта сьведчыць аб узросьце ў нас культуры, аб росквіце гістарычнай навукі.

Аднак, на наш погляд, нам пішэ ня ўсе зроблена. Мы атрымалі ад небяспекі бяць зьнішчанымі архівы дарэвалюцыйных устаноў (гістарычныя архівы), архівы савецкіх і прафэсыянальных устаноў нашага часу. Справа ў тым, мы на маем цэнтралізаванасьці архіваў нашых партыйных і камсамольскіх арганізацый, каштоўнасьць якіх, безумоўна, стаіць на адноўкавай, калі ня вышэйшай ступені з архівамі савецкіх устаноў. У той час, калі савецкія ўстановы пакланаціліся і паставілі на належную вышыню архіўную справу, нашы партыйныя арганізацыі ў гэтым спазьніліся. Да гэтага часу мы ня маем Цэнтральнага Партыйнага Архіву, дзе-б былі забясьпечаны ад зьнішчэньня архівы, начыняючы ад нізавых партыйных арганізацый і канчаючы архівамі ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ.

Праўда, гістпартам ЦК КП(б)Б з'арганізаваны Музэй Рэвалюцыі, пры якім захоўваецца частка архіўных матар'ялаў гістарычнага значэньня, якія складаюць Архіў Гістпарту. Але гэта справы абсалютна не выратоўвае, бо да гэтага часу адсутнічае плянавая ахова партыйных і камсамольскіх архіваў, няма інструктаваньня, знаходзячыся на мясцох, становячыся непатрэбным для бягучай дзейнасьці, архівы працуюць.

У той час, калі ў партыйных арганізацыях і паставлена больш-менш архіўная справа спрыяюча, то ў адносінах да архіваў камсамольскіх арганізацый можна ўпэўнена сказаць, што за адсутнасьцю адпаведнага вока, яны гінуць, гіпо на нашых вачох тое запісанае, што нямі завяраюць, што нямі бяруцца з бою—наша ўпартае будаўніцтва, наша жыцьцё.

І ня толькі ў адносінах да будучыні, „для гісторыі", нам патрэбна ахова нашых партыйных і камсамольскіх архіваў. Для нашага практычнага будаўніцтва яны нам патрэбны, а ў той час іх або няма, або невядома дзе і шукаць.

У сувязі з такім становішчам, у сувязі в тым, што наша партыйнае будаўніцтва з-за свае занятасьці больш актуальнымі пытаньнямі сёньняшняга дня,—спазьнілася з вырашэньнем архіўнай справы партыйн. і камсамольскіх арганізацый Беларусі,—мы ўздымаем у друку прапанову аб арганізацыі на Беларусі, пры гістпарце ЦК КП(б)Б, як пэўнай аўтаномнай адзінкі, а ня як архіву гістпарту пры Музэі Рэвалюцыі,—побач з утвораным тры гады таму назад Музэем Рэвалюцыі БССР—Цэнтральнага Партыйнага Архіву.

Пытаньне, на наш погляд, вельмі сур'ёзнае і патрэбнае, патрабуючае канчатковага вырашэньня з боку нашых цэнтральных партыйных органаў.

Іл. Барашка.

Ніводнага апазыцыянэра не павінен у радох камсамолу.

ПАСТАНОВА Б�ЮРО ЦК ЛКСМБ АБ АДНОСІНАХ ДА АПАЗЫЦЫІ Ў ЛКСМБ.

Пастанова XV зьезду ВсесКП(б) па пытаньні аб трацкісцкай апазыцыі вызначае і адносіны ЛКСМБ да прыхільнікаў трацкісцкае апазыцыі ў камсамоле.

Выходзячы з гэтага бюро ЦК ЛКСМБ лічыць несумясьцімым падзяленьне і прапаганду поглядаў трацкісцкае меншавіцкае апазыцыі з прабываньнем у радох ЛКСМБ.

Бюро ЦК ЛКСМБ прапануе ўсім арганізацыям ЛКСМБ запатрабаваць ад кожнага камсамольца-апазыцыянэра зараз-жа і безагаворачна прызнаць свае памылкі і заявіць аб гэтым перад усімі камсамольцамі (ячэйкавы сход, канфэрэнцыі, друк), патрабаваць ад кожнага прымаўшага ўдзел у фракцыйнай дзейнасьці поўнага растлумачэньня і вычэрпваючых матар'ялаў аб сваёй фракцыйнай рабоце.

Бюро ЦК ЛКСМБ прапануе ўсім арганізацыям, праводзячы шырокую і глыбокую работу па пераконаньні членаў ЛКСМБ, якія падтрымліваюць апазыцыю, прыняць усе неабходныя меры да ачышчэньня саюзу «ад усіх яўна непаправімых элемэнтаў трацкісцкае апазыцыі» (15 партзьезд), цесна ўвязаўшы гэтую работу з растлумачэньнем пастаноў 15 зьезду ВсесКП(б).

ЦК ЛКСМБ пастанаўляе выключыць з ЛКСМБ усіх камсамольцаў апазыцыянэраў, ня прызнаўшых сваіх палітычных і арганізацыйных памылак.

Выключыць з ЛКСМБ усіх кандыдатаў ЛКСМБ, якія падзялялі і падзяляюць погляды трацкісцкае апазыцыі, ня гледзячы на іх адмежаваньне ад апазыцыі, як ня вытрымаўшых палітычнага экзамену пры ўступленьні ў ЛКСМБ.

Выключаных з ЛКСМБ апазыцыянэраў, заявіўшых аб адыходзе ад апазыцыі, прымаць у ЛКСМБ толькі пры ўмове выстарчальнай палітычнай праверкі і толькі індывідуальным шляхам. Паставіць задачай арганізацыі ЛКСМБ неабходнасьць больш узмоцненай выхаваўчай работы сярод камсамольцаў, якія хісталіся ў часе дыскусіі (асабліва сярод устрымаўшыхся і не галасаваўшых).

Вывучаем пастановы 15-га партзьезду.

(Магілеўская гарадзкая партарганізацыя).

Па ўсіх ячэйках нашай арганізацыі пачалася прапрацоўка матар'ялаў і пастаноў 15-га партзьезду. З вялікай зацікаўленасьцю і актыўнасьцю праходзяць тыя партсходы, на якіх абгаворваюцца пасобныя тэмы з дакладаў 15 партзьезду. Для дапамогі парт'ячэйкам гаркомам вылучаны таварышы і прымацаваны да ячэек.

Партсходы праводзяцца адчыненымі, на іх прыходзіць і шмат беспартыйных рабочых. У прапрацоўку і вывучэньне пастаноў зьезду ўцягнуты ўсе партыйцы. У партшколах таксама пачалі распрацоўваць пастановы 15-га партзьезду.

С—ў.

Лепш менш, а лепш.

(Грэская ячэйка КП(б)Б, Менскай акругі).

У працы нашых парт'ячэек вельмі часта заўважваецца, што яны імкнуцца зрабіць многае, абхапіць, як гаворыцца, недасяжнае, але ў іх на гэта не хапае сіл, і на справе выходзіць тое, што ва ўсіх галінах праца слабая.

Яркі прыклад: наша грэская ячэйка пры правядзеньні перавыбараў дэлегацкіх сходаў, ня гледзячы на даныя дырэктывы РК арганізаваць дэлегацкія пункты толькі там, дзе можна іх абслугоўваць, арганізавала адзін дэлегацкі пункт за 6 вёрст ад Грэску і нават у другім сельсавеце. У выніку гэтага праца па гэтым пункце не праводзіцца і праводзіць да нямогчыма.

Я лічу, што трэба ячэйкам больш сур'ёзна падыходзіць да справы, трэба пытаньні працы, якія-б яны ня былі, абгаворваць усебакова і рабіць правільныя вывады, трэба выконваць і лічыцца з дырэктывамі і кіравацца палажэньнем аб працы ячэек.

Трэба добра наладзіць працу ў бліжэйшых вёсках свайго сельсавету, якія маюцца за 2—3 вярсты, а праца ў іх амаль зусім не вядзецца; ня трэба гнацца за колькасьцю, а палепшыць і добра палепшыць якасьць працы ў першую чаргу ў самым Грэску.

Лабашоў.

Чарговая лекцыя ў нядзельным камвузе.

8-га студзеня, а 11 гадз. раніцы, у малой залі клюбу К. Маркса адбудзецца чарговая лекцыя ў нядзельным вэрсытэце на тэму: „Сусьветная гаспадарка і камуністычным уклад СССР". Лектар тав. Слесінк.

Літэратура да лекцыі—мінімум: Даклад тав. Бухарына на 7-м пленуме Камінтэрну. Стэнаграфічная справаздача, 1-ы том, стар. 30—83.

Максымум: М. Спэктатар—„Да пытаньня аб стабілізацыі капіталізму", стар. 170—184.

„Сацыялістычная гаспадарка" за 1927 г., № 1, артыкул т. Літвінава аб стабілізацыі капіталізму.

Заданьні атрымліваць у агітпрапагбінэце. Там жа маецца і літэратура.

АПА Менакругкому КП(б)Б.
Праўленьне нядзельнага камвузу.

НАРАДА.

На 6-га студзеня, а 7-й гадзіне ўвечары, у залі пасяджэньняў ЦК КП(б)Б скліканецца нарада па пытаньні пастаноўкі працы аддзелу „Партыйнае Жыцьцё" ў газ. „Зьвязда".

Уваход па разаспаных позвах.

Рэдакцыя газ. „Зьвязда".

ЗА АБАРОНУ СССР.

Асоавіяхім і дзесяцігодзьдзе Чырвонай арміі.

Да дзесятай гадавіны Чырвонае арміі засталося менш двух месяцаў. Тэрмін зусім невялікі. Падрыхтоўку да юбілею трэба пачынаць зараз-жа ва ўсіх арганізацыях Асоавіяхіму як гарадзкіх, так і вясковых. Сьвята Чырвонай арміі асабліва блізка Асоавіяхіму. Кампанія падрыхтоўкі да правядзеньня дня Чырвонай арміі і самае правядзеньне сьвяткаваньня павінна зьявіцца для Асоавіяхіму кампаніяй падвядзеньня вынікаў таго, што зроблена для Чырвонай арміі і для ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны.

Агляд Чырвонае арміі павінен зьявіцца і аглядам Асоавіяхіму.

Праводзіць кампанію па падрыхтоўцы да дзесяцігодзьдзя, як самастойную, было-б надзвычайна памылковым. У аснову ўсіх плянаў яе правядзеньня неабходна палажыць даклады на 15-м партзьезьдзе і вынесеныя ім пастановы па міжнародным пытаньні. У часе кампаніі неабходна энэргічна выкрываць усю тую брахню капіталістых аб «міры» і «разброеньні». Асабліва неабходна памятаць указаньні зьезду аб тым, што «капіталістычнае разьвіцьцё ў цэлым выявіла тэндэнцыю скараціць гістарычныя тэрміны мірнага «перапынку», наблізіць новую паласу вялікіх імпэрыялістычных войн і паскорыць рэвалюцыйную разьвязку сусьветных канфліктаў».

Разам з гэтым трэба, як і раней, растлумачваць нашу палітыку міру.

Прамова т. Варашылова на 15-м зьезьдзе павінна быць праграмай да ўсяе работы Асоавіяхіму. Яна яскрава і пераканаўча гаворыць аб нашых задачах. У часе кампаніі трэба практычна намячаць канкрэтныя шляхі да іх ажыцьцяўленьня.

Усе члены Асоавіяхіму, усе працоўныя павінны ведаць гісторыю Чырвонае арміі. Бібліятэкі павінны папоўніцца літаратураю аб Чырвонай арміі. На агульных сходах рабочых, у гутарках і лекцыях на вёсцы трэба расказваць аб аб барацьбе Чырвонай арміі.

Трэба ўспомніць аб тым, у якім небясьпечным становішчы мы знаходзіліся і з якімі сіламі і сродкамі змагні выйсьці пераможнікамі з барацьбы.

Падрыхтоўка да юбілейных дзён Чырвонае арміі павінна зьявіцца штуршком для далейшага росту Асоавіяхіму і для ажыўленьня ўсяе яго масавае работы.

У самыя дні сьвята павінны быць павочна прадэманстраваны перад працоўнымі практычныя дасягненьні гурткоў Асоавіяхіму, асабліва вайсковых ведаў і стралковых. Усе гурткі павінны арганізавана ўдзельнічаць у парадах Чырвонае арміі.

Напярэдадні сьвята Асоавіяхім павінен правесьці рад спаборніцтваў, паказальныя бойкі, паказальную абарону ад хэмічных нападаў, конкурсы на лепшага стральца і г. д.

Ва ўсіх клюбах, хатах-чытальнях, дзе зьбіраецца шмат насельніцтва, неабходна арганізаваць выстаўкі з гісторыі барацьбы Чырвонае арміі. Асаблівую ўвагу трэба будзе зьвярнуць на правядзеньне сьвята ў вёсцы.

Асоавіяхім павінен зараз-жа распрацаваць спэцыяльныя пляны з вучотам максымальнага выкарыстаньня для вёскі гарадзкіх сіл.

Гэта кампанія павінна паставіць на вырашэньне асноўную задачу Асоавіяхіму на вёсцы—павялічэньне ліку членаў і разгортваньне плянавае масавае работы.

Вось тыя канкрэтныя задачы, якія стаяць перад Асоавіяхімам у зьвязку з сьвятам Чырвонае арміі. Толькі падрыхтаваўшыся да гэтае кампаніі, Асоавіяхім справіцца з імі.

ЛЕПШАЯ ЯЧЭЙКА.

(Ворша).

Ячэйка Асоавіяхіму пры аршанскай канторы сувязі іскуе з жніўня месяца 1927 году. За 4 месяцы лік членаў ячэйкі з 20 чалавек павялічыўся да 80, што складае 95 проц. агульнага штату канторы. Работа вядзецца рэгулярна ў кожны чацьвер. Праведзена звыш 10 лекцый і гутарак. Абсталяваны вайсковы куток. Добра працуе стралковы гурток, які зараз праводзіць падрыхтоўку да завочных стралковых спаборніцтваў, што арганізуюцца ЦК саюзу сувязі СССР у сакавіку 1928 году. Першыя вынікі стральбы здаваньняючыя: з 30 таварышаў налічваецца 5 добрых стралкоў, з іх адна жанчына. Сьвяістыя выяўляюць вялікую зацікаўленасьць да валянізацыі: па справаздачы ячэйкі на сходзе было задана 20 пытаньняў, у спрэчках са здаровай крытыкай выступала 10 чалавек.

Адзін недахоп—гэта мала сродкаў.

Ячэйка Асоавіяхіму сувязі зьяўляецца найлепшай ячэйкай,—сказаў прадстаўнік акруговага савету Асоавіяхіму, яна служыць прыкладам для іншых.

Міхееў.

ЧУЖАЯ АРМІЯ.

„Польская Збройна" (вайсковая газэта) зьмяшчае заметкі аб адносінах насельніцтва да вайсковых часьцей пад час манэўраў.

„На Захадзе армія ўсюды зьяўляецца аб'ектам вялікай увагі і сымпатыі з боку насельніцтва; у Польшчы гэтага не наглядаецца і нават наадварот, насельніцтва ня толькі ня вітае праходзячых салдат ухмылкаю, крыкамі і радасьці, кветкамі, што кідаюцца пад ногі тых, маладое жыцьцё якіх заўтра можа быць прынесена ў ахвяру бацькаўшчыне, але нават сорам чытаць; напрыклад, у адной з кракаўскіх газэт зазначаецца, як насельніцтва аднаго з мястэчак выступіла з агульнай просьбай да бургомістра аб тым, каб ня прымаць польскіх афіцэраў на кватэры".

Далей газэта, зьмяшчаючы артыкул пад загалоўкам „Беспрыкладна" піша: „мы не дапускаем думкі, што наступны дзень прынясе нам новы доказ „жывых сымпатый", якімі грамадзянства дорыць сваю нацыянальную ўзброеную сілу. „Польска Збройна" падае вытрымку з адной пазнанскай газэты, дзе гаворыцца, як у адным мястэчку ксёндз выгнаў з касьцёла салдат 29-га палка, крычучы: „войска вон". У гэта ўмяшаўся нават вышэйшы штабны афіцэр, але нічога не памагло—піша газэта.

І далей „Польска Збройна" падае цытату з газэты:

„29-ы полк з Мурыванны Госьліны пакіраўся ў фальварак у Балекава, зьяўляецца ўласнасьцю аднаго сэнатара. Там афіцэрству палка заявілі, што „афіцэраў на кватэру ў палац ня прымаюць".

Вось гэтыя факты досыць ясна характарызуюць адносіны польскага насельніцтва да „сваёй" арміі. Ня гледзячы на крыкі аб тым, што польская армія зьяўляецца армій народу, які яе любіць і цэніць, польскі-ж буржуазны друк прымушаны прызнаць усім адваротнае.

Падарункі ад палітвязьняў Польшчы працоўным БССР.

(Мітынг у клюбе Карла Маркса).

Учора вечарам у клюбе Карла Маркса адбыўся мітынг, прысьвечаны прыезду польскіх камуністых, вызваленых з панскіх турмаў.

Польскі камуністы т. Гржэльшак, спатканы шумнай авацыяй, адзначыў у сваім прывітаньні тую вялікую радасьць, якую адчулі былыя палітвязьні, калі яны пераступілі на тэрыторыю Сацыялістычнай бацькаўшчыны—СССР. Тав. Гржэльшак перадаў прывітаньне ад палітвязьняў Макатоўскай турмы і падарункі—маленькую мадэль электрычнай станцыі, зробленую вязьнямі з хлебу—сымбаль электрыфікацыі СССР, і скрынку—таксама работы палітвязьняў. Падарункі прысланы ў падзяку за дапамогу рабочых і сялян БССР палітвязьням Польшчы.

Тав. Мэртэнс перадаў прывітаньне ад палітвязьняў турмаў Заходняй Беларусі, дзе пакутуюць тысячы беларускіх рабочых і сялян. Прамоўца ахарактарызаваў надзвычайна цяжкія ўмовы панскіх казэматаў. Мітынг скончыўся позна вечарам. Ноччу польскія таварышы выехалі ў Маскву.

Да перавыбараў сельсаветаў.

Дасягненьні і недахопы нашых сельсаветаў.

(Ад нашага слуцкага карэспандэнта).

Сельсаветы раёну за час сваёй гадовай працы маюць дасягненьні як у галіне падъёму эканамічнага становішча раёну, так і яго культурнага ўзроўню і росту актыўнасьці мас.

Паменшылася колькасьць бядняцкіх гаспадарак. Так, у 1926 г. сялянскіх гаспадарак без рабочай жывёлы было 8,1 проц., у гэтым годзе—6,5 проц., бескароўных было 3,35 проц., сёлета 2,9 проц. Павялічылася плошча пад пасевамі на 2 проц. У выніку агранамічных мерапрыемстваў павялічылася ўдзельная вага коранаплодаў і культурных траў: так, культтравы ў мінулым годзе складалі ў адносінах да агульнага ліку пасеваў 7,8 проц., а сёлета—9,5 проц., коранаплоды—0,5 проц., сёлета—0,9 проц. Сьвінаводзтва супроць 1926 г. узрасло на 20 проц.

Усяго за гэты год земляўпарадкавана 12.501 дзес., раздана зямельнага фонду—12.490 дзес., надзелена малазямельных і безьзямельных 3.439 гаспадарак. У часе гэтай працы была аказана значная дапамога бядняцкаму насельніцтву: вызвалена ад платы за земляўпарадкаваньне 158 двароў на суму звыш 2.000 р.

Шматпольле ўведзена ўсяго ў 1.010 гаспадарках на плошчы 6.070 дзес.

Праароблена значная праца па аказаньні дапамогі біднейшаму і серадняцкаму насельніцтву крэдытаваньнем: за год выдана доўгатэрміновага і коратка-тэрміновага крэдыту на суму 54.428 руб. Па розных відах страхаваньня выплачана 97.600 руб. Бюджэт раёну ўзрос на 33,7 проц. супроць леташняга году.

Адкрыта 6 новых школ па раёне і будуецца яшчэ адна.

Недахопамі ў працы саветаў зьяўляецца яшчэ невыстарчальная работа камісій сельсаветаў: так, больш-менш здавальняюча працавалі толькі падатковыя камісіі, якія прымалі ўдзел у разглядзе скаргаў і залў сялянства ў працы па вучоце аб'ектаў ападаткаваньня. Іншыя камісіі працуюць слаба. Слаба працуюць члены сельсаветаў, якія не знаходзяцца на платнай рабоце.

Усе гэтыя моманты будуць пастаўлены на абгаварэньне шырокай сялянскай грамадзкасьці [illegible]

Батрацтва і перавыбары.

ПОЛАЦАК. (Уласн. кар.). Вынікі перавыбараў саветаў мінулага году паказалі, што ўдзел саюзных мас у гэтай вялікай рабоце быў невыстарчальны. У часе перавыбараў саюзная маса, асабліва батракі і сэзонныя рабочыя, якімі багата Полацкая акруга, ня была выстарчальна ахоплены. І гэтым самым быў зьнішчан твар саюзнай масы, праз якую партыя і савецкая ўлада праводзяць кіраўнічую ролю пралетарыяту над сялянствам.

Гэта прымусіла прэзыдыум полацкага АСПС заняцца гэтым пытаньнем і на сваім чарговым пасяджэньні выпрацавала канкрэтныя мерапрыемствы аб удзеле саюзных арганізацый у перавыбарах саветаў.

Першае з мерапрыемстваў, якое бязумоўна дасьць належны штуршок па ўзварушэньні саюзнай масы, гэта выезд членаў прэзыдыуму ў раён на сходы прафактыву.

Па некаторых раёнах гэтыя сходы ўжо прайшлі і на іх распрацованы канкрэтныя мерапрыемствы па скліканьні батракоў на сходы. Вынікі гэтых сходаў абяцаюць, што кампанія па справаздачах і перавыбарах сельсаветаў пройдзе з вялікім удзелам саюзнай масы.

Поруч з гэтым прэзыдыум АСПС даў дырэктыву ўсім саюзам, каб яны ўсю сваю культпрацу, насьценныя газэты, чырвоныя гурткі прыстасавалі да гэтае кампаніі.

Сіпчанка.

Справаздачы пачаліся.

РАГАЧЭЎ. (Уласн. кар.) У канцы сьнежня месяца 1927 году ад[illegible]

Агітацыйна-масавая праца парт'ячэек у вёсцы

ў сувязі з перавыбарамі сельсаветаў.

З 15 студзеня пачынаецца кампанія перавыбараў саветаў. Ад пасьпяховага правядзеньня гэтай кампаніі залежыць далейшае ўзмацненьне саветаў у вёсцы, ажыўленьне іх дзейнасьці і ўцягненьне самых шырокіх колаў серадняку, беднаку і батрацтва ў актыўную працу па кіраваньні краінай. Таму кампанія перавыбараў саветаў зьяўляецца аднэй з адказнейшых кампаній, па выніках якой будзе расцэньвацца аўтарытэт партыйнай арганізацыі ў вёсцы і ўплыў пралетарыяту на сялянства.

Нядаўна скончыўшы сваю працу XV зьезд ВсесКП(б) паставіў перад партыяй наступную задачу ў галіне перавыбараў: «У сувязі з будучымі ў пачатку 1928 году перавыбарамі саветаў, разгарнуць шырокую справаздачную кампанію аб працы с.-саветаў па ўцягненьні ў выбары максімуму бядняцка-серадняцкіх пластоў, забясьпечыць кіраўніцтва партыі ва ўсёй перавыбарчай кампаніі і строга сачыць за тым, каб устаноўленыя адпаведнай выбарчай інструкцыяй (1928 г.) нормы выключэньня з выбарчых сьпісаў кулацкіх і іншых антысавецкіх элемэнтаў праводзіліся са ўсёй строгасьцю». У такім напрамку і будуць праходзіць перавыбары саветаў у сучасную перавыбарчую кампанію.

Неабходна ўлічыць, што перавыбарчая кампанія ў гэтым годзе бу[illegible] пры ўзросшай ак[illegible] пластоў сялянства, [illegible] і серадняку, [illegible] рожа настроеных кулацкіх элемэнтаў, якія прабуюць выкарыстаць перавыбарчую кампанію для таго, каб пралезьці альбо правесьці свае кандыдатуры ў саветы.

Посьпехі перавыбарчай кампаніі ў значнай ступені будуць залежаць ад падрыхтаванасьці і арганізаванасьці: чым лепш будзе праведзена падрыхтоўка, чым шырэй будзе пастаўлена агітацыйна-масавая праца парт'ячэек сярод сялянства, чым больш будзе праяўлена ініцыятывы і шырэй у кампанію ўцягнена сялянства, тым больш гарантый у тым, што з пастаўленай задачай мы справімся і кампанія пройдзе в найбольшым посьпехам, што яшчэ болей умацуе бядняцка-серадняцкі блёк, які пад арганізаваным кіраўніцтвам партыі дасьць рашучы адпор кулацтву, якое прабуе выкарыстаць перавыбары ў сваіх інтарэсах.

Ва ўсёй працы перавыбараў павінна заняць немалаважнае месца агітацыйна-масавая праца. У мінулай перавыбарчай кампаніі гэта праца зьяўлялася адным з слабых месц, і калегія ЦК ВсесКП(б) па дакладу АПА Менакругкому адзначыла, што некаторае паніжэньне процанту прымаўшага ўдзел у перавыбарах сялянства часткова тлумачыцца слабай пастаноўкай агітацыйна-масавай работы.

Менакругком КП(б)Б пры падвядзеньні вынікаў мінулай перавыбарчай кампаніі канстатаваў, што ў агітацыйна-масавай працы былі наступныя недахопы: слабае выкарыстаньне, як мер агітацыі, насьценных газэт, хат-чытальняў, клюбаў і нардамоў, недастатковы ўдзел у перавыбарах грамадзкіх арганізацый і недастатковае правядзеньне масавай працы сярод сялянства. Усё гэта мела некаторы адбітак на наведваемасьці сходаў, асабліва з боку беднаты, батрацтва і жанчын.

Парт'ячэйкі павінны так падрыхтаваць хаты-чытальні, нардамы, чырвоныя куткі, каб яны ў часе перавыбараў будавалі сваю працу вакол пытаньняў перавыбараў саветаў, а іхняя праца павінна ісьці ў такім напрамку:

Ва ўсёй працы культурных устаноў неабходна адвесьці вялікае месца найбольш поўнаму высьвятленьню працы саветаў, праз насьценныя газэты, правядзеньне вечароў пытаньняў і адказаў, правядзеньне спэцыяльных гутарак аб працы саветаў, складаньне дыяграм па пасобных пытаньнях, праверка выкананьня наказу і прапрацоўка наказу новаабіраемаму савету.

Значная частка сялянства, асабліва беднота і батрацтва ня досыць знаёма з тым, хто мае права абіраць і быць абраным, дзякуючы чаму некаторая частка кулацтва, якая па інструкцыі павінна быць пазбаўлена выбарчых правоў, не пазбаўляецца іх. Таму неабходна зараз-жа працу сталоў справак прыстасаваць да абслугоўваньня гэтай кампаніі, на жывых прыкладах растлумачваць працоўнаму насельніцтву інструкцыю перавыбараў.

Неабходна разьвіць самую шырокую працу па ўзьняцьці палітычнага самаўсьведамленьня адсталай часткі вёскі, дабіваючыся ажыцьцяўленьня лёзунгу: ніводнага сьвядомага грамадзяніна, ня ўдзельнічаючага ў перавыбарах саветаў.

Культурна-масавыя ўстановы павінны аказаць вялікую дапамогу партыйным арганізацыям у справе арганізацыі беднаты і батрацтва ў справе замацаваньня блёку беднаты з сераднякамі, растлумачваючы беднаце і серадняцтву, чаму гэты блёк абодвым выгадны і г. д.

Дапамагчы партыйным і савецкім органам у падборы працаздольных, чэсных і сталчых на варце інтарэсаў савецкае ўлады беднякоў і сераднякоў у склад сельсавету, ствараючы вакол іх грамадзкую думку.

Праца надзвычайна вялікая і адказная, і аднаму загадчыку хаты-чытальні альбо нардому яна не пад сілу. Да гэтай працы неабходна прыцягнуць сялянскі актыў, грамадзкія арганізацыі і савецкую інтэлігенцыю. Толькі пры ўмелым выкарыстаньні сялянскага актыву, інтэлігенцыі і грамадзкіх арганізацый в гэтай працай культурныя ўстановы спраўляцца і даб'юцца станоўчых вынікаў.

У пэрыяд справаздачна-перавыбарчай кампаніі асабліва важнае значэньне пабывае праца сельскораў. Яна павінна быць накіравана па двух напрамках: па лініі высьвятленьня як у насьценных, так і цэнтральных газэтах працы саветаў, іх дасягненьняў і [illegible] таксама па лініі [illegible] ходу перавыбараў.

Партарганізацыі [illegible] чыць, што зн[illegible] інтэлігенцыі, [illegible] разьдзяляючы пункт погляду партыі і зьвязаўшыя свой лёс з лёсам саветаў, уцягнулася ў грамадзкую працу вёскі, на грамадзкай працы працуе нядрэнна і карыстаецца сярод сялянства аўтарытэтам. Гэта савецкая інтэлігенцыя здолее пры ўмелым прыцягненьні яе да перавыбараў саветаў ня мала дапамагчы партарганізацыі, бо настаўнік, працуючы некалькі год у аднэй і тэй-жа вёсцы, больш чымся хто знаёмы з умовамі свае вёскі, ведае і здаровыя і хворыя бакі. За гэтым партарганізацыям неабходна шырока прыцягнуць яе да кампаніі перавыбараў саветаў, азнаёміўшы яе са становішчам і задачамі сучаснай перавыбарчай кампаніі, шляхам прыцягненьня на інструкцыйныя нарады, пастаноўкай дакладаў на райсходах і г. д.

Праца шэфаў не заўсёды ў дастатковай меры ўзяваецца з тымі задачамі, якія ставяцца райпартарганізацыяй і РВК. Часта з прычыны гэтай недагаворанасьці атрымоўваецца разнабой, які тармозіць працу. Такі разнабой асабліва шкодны ў пэрыяд правядзеньня перавыбарнай кампаніі [illegible] чэньня [illegible] райпраўл[illegible] абходн[illegible] гавар[illegible] ных [illegible] Ант[illegible] р[illegible] б[illegible]

РАШУЧЫ КУРС НА РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫЮ.

„Генэральная ўстаноўка на індустрыялізацыю павінна суправоджвацца рашучым курсам на рацыяналізацыю вытворчасьці і кіраўніцтва... Рацыяналізацыя на надыходзячы пэрыяд зьяўляецца вузлавой задачай“.

(З рэзалюцыі XV зьезду УсеКП(б).

Найважнейшыя ўмовы правядзеньня рацыяналізацыі.

(Да пастаноў 15-га партзьезду).

Цьвёрды курс на рацыяналізацыю, узяты 15-м партыйным зьездам, азначае далейшы крок уперад па шляху сацыялістычнага будаўніцтва. Звароту да мінулага няма і ня можа быць, мы павінны ісьці ўперад, маляпшаючы тэхніку і арганізацыю вытворчасьці, зьніжаючы цэны і павышаючы якасьць тавараў.

Рашучая барацьба з усімі перашкодамі, што стаяць на шляху рацыяналізацыі, абвешчана па ўсім фронце. Але для таго, каб барацьба вялася пасьпяхова, каб вынікі рацыяналізацыі былі карыснымі для народнай гаспадаркі ў цэлым, так і для рабочых, асабліва, неабходна выкананьне ў першую чаргу наступных найважнейшых умоў.

Напершае, неабходна адмовіцца ад саматужных мэтадаў і «рабскага тэмпу» работы і перайсьці да больш дасканалых на падставе мэсавага прыгатаўленьня стандартных памераў.

Для ажыцьцяўленьня гэтай найважнейшай умовы трэба, каб усе былі прасякнуты сьвядомасьцю неабходнасьці масавае вытворчасьці. Правесьці ў жыцьцё спэцыялізацыю заводаў, абмежаваць рознароднасьць выпускаемых прадуктаў, і прыстасаваць заводы да лепшага выкананьня кожнае апэрацыі можна толькі тады, калі неабходнасьць усяго гэтага прасякне ў сьвядомасьць як кіраўнікоў прамысловасьці, так і шырокай рабочай масы.

На практыцы мы бачым, як марудна ідзе гэты працэс і як многія добрыя пажаданьні застаюцца на словах і на паперы.

Падругое, сродкі, якія затрачваюцца на вытворчасьць, павінны зварочвацца больш шпарка; не павінна быць лішніх запасаў сырцу, паўфабрыкатаў і вырабаў. Заводы павінны працаваць у цесным супрацоўніцтве паміж сабою, не глядзець на сабе, як на самамэту, а як на складаную частку сацыялістычнай гаспадаркі, дапамагаючы адзін другому сваячасовым выкананьнем заказаў.

Не разьлічваючы на атрыманьне сваячасова сырцу і паўфабрыкатаў, многія заводы робяць усё лішчэ вялікія запасы, трацячы на гэта непрадукцыйна вялізарныя сродкі.

Патрэцяе, сама вытворчасьць павінна весьціся на навуковых пачатках, а ня «дзедаўскім спосабам». На заводзкія лябараторыі і навукова-дасьледчыя інстытуты павінна быць зьвернута асаблівая ўвага. Не сьляпым капʼяваньнем, а сьвядомай творчай работай мы зможам насунуць нашу тэхніку ўперад. Мы павінны накапляць практыку, якое нам не хапае, і дзяліцца ёю паміж сабою. Заводы павінны перадаваць на вырашэньне лябараторый пытаньні, якія яны ня могуць вырашыць у сябе, лябараторыі ў сваю чаргу—укараняць у вытворчасьць свае дасягненьні, што праверены імі ў паўзаводзкім маштабе.

Пачацьвертае, дасягненьні чужаземнай тэхнікі, якія праверены на практыцы, павінны быць шырока скарыстаны намі. Трэба зьвярнуць увагу, як на атрыманьне чужаземных тэхнічных часопісаў, так і на іх выкарыстоўваньне. Нашы тэхнічныя бібліятэкі зусім невыстарчальныя і моцна адсталі ад эўрапейскіх, не гаворачы ўжо аб амэрыканскіх.

Амэрыканская практыка паказвае, што перш, чым ставіць новае прадпрыемства, трэба правесьці рад дасьледчых работ у лябараторыях. А для таго, каб прыступіць да дасьледчых работ, трэба сабраць увесь літаратурны матарʼял па даным пытаньні.

Памылкі на першых парах няўнікнёны ў кожнай новай справе, але мы ўжо выйшлі на шырокую дарогу будаўніцтва сацыялізму. Пытаньні вытворчасьці стаяць у цэнтры ўвагі кожнага гаспадарніка і кожнага рабочага. Лепшыя ўмовы жыцьця і працы дасягаюцца шляхам атрыманьня лепшых вытворчых вынікаў ад затрачваемых дзяржаваю сродкаў.

Пераняўшы ад нашых ворагаў іх зброю—сучасную тэхніку і арганізацыю вытворчасьці,—мы ўзмоцнім наш Саюз і закончым будаўніцтва сацыялізму.

Я. В.

Школа культурных і кваліфікаваных рабочых.

(Фабзавуч Зах. чыгунак).

На адным з апошніх пасяджэньняў Менскага Вучпрафсожу Зах. чыгунак быў заслухан даклад загадчыка Менскага фабзавучу чыгуначнікаў. Вучпрафсож прызнаў, што кіраўніцтва і пастаноўка тэарытычнага і практычнага навучаньня праводзіцца здавальняюча. Да гэтага году навучаньне ў Менскай школе фабзавучу было разьлічана на чатыры гады, але з будучага году кожны выпуск будзе адбывацца пасьля трох-гадовага навучаньня. У гэтым годзе ёсьць усе шансы на пасьпяховае выкананьне праграмы, як, напр.: паяўнасьць падручнікаў да 75 проц. патрэбнасьці ў іх, увязка праграмы з навучаньнем на вытворчасьці і інш. У гэтым годзе адбудуцца два выпускі: першы ў бягучым месяцы і другі—у чэрвені. Нажаль, няма ў школе сталярнай майстэрні, якая вельмі неабходна. Адсутнічае па-зашкольная праца. Інтэрнат пры школе разьлічаны на 18 чалавек, а фактычна жыве там 30. Памяшканьне інтэрнату вельмі цеснае. Менскі вучпрафсож пастанавіў прасіць адміністрацыю чыгункі прымаць скончыўшых фабзавуч на працу ў першую чаргу.

М. Вярнікоўскі.

Вальцоўка загуляла.

(Дражджавы завод „Прапетары“.)

Бяда, браткі. Вальцоўка наша загуляла. Чакаючы пераходу на новы малясны спосаб выпрацоўкі, давялі вальцы да белага каленьня. Замест 50 хвілін або гадзіны на вальцоўку 91 пуда збожжа прыходзіцца траціць часу ў два разы больш. Апрача таго маса збожжа праходзіць цалком. Гэта адбіваецца як на якасьці затору, так і на выхадах прадукцыі.

Ці цікавіцца хто гэтым? Можна сказаць, што ніхто. Вальцоўшчыкі маўчаць, старэйшыя квасільшчыкі не глядзяць за выхадам прадукцыі.

Р. К.

Звычайная гісторыя.

— Не, так нельга падходзіць,—захваляваўся старшыня трэсту,—я разумею, што трэба скарачаць выдаткі, але нельга-ж ламаць апарату. Я зусім ня згодзен з таварышам з РСІ.

Таварыш з РСІ спакойна прапанаваў —давайце разам паглядзімо, дзе ў вас можна сьпіснуцца, тады будзем гаварыць аб ломцы апарату.

— Давайце, пацісну'ў плячыма „пред“.

Намесьнік старшыні ўзяў сьпіс і стаў чытаць:—у фінадзеле штат 114 чалавек: загадчык, 6 галоўбухаў, 15 памгалоўбухаў, 38 загадчыкаў часьлямі і аддзяленьнямі, 24 сакратары, 16 дзялаводаў, 11 рахункаводаў, касір і 2 кур'ёры. Скараціць нічога нельга.

Тав. з РСІ уважліва глянуў па намесьніка старшыні:—так такі і нельга? А калі аб'яднаць некаторыя часьці і аддзяленьні, то лік загадчыкаў часьцямі зьменшыцца.

Намесьнік старшыні кіўнуў галавой.

— Значыць,—гаварыў далей таварыш з РСІ,—трэба прагледзець работу фінаддзелу і рацыяналізаваць яе.

З месца саскочыў загадчык фінаддзелу:

— Таварышы, гаворыць аб рабоце фінаддзелу, ня гледючы яе. Я пратвэтую. Я лічу, што пры цяперашніх нашых зваротах и аб якім скарачэньні штатаў у маім аддзеле і гаворкі быць ня можа. Пры тым жа ўтрыманьне штату фінаддзелу каштуе нам досыць такі танна, глупства некалькі тысяч рублёў у месяц. Я прапаную перайсьці да другіх аддзелаў.

Старшыня кіўнуў галавой. Намесьнік прачытаў далей: —аргаддзел. Штат 32 чал.: 26 інструктароў—па 2 на округу, фінчасьць—12 чалавек, касір, рахункова часьць і кур'ер.

— Тут ніяк не пакароціш,—разьвёў рукамі загадчык аргаддзелу,—я і так хацеў прасіць аб павялічэньні штатаў у зьвязку...

Старшыня зрабіў сур'ёзную міну:—дырэктыву ўраду выканаем. Канкрэтна прапаную скараціць ва ўсіх аддзелах 50 проц. кур'ераў. Мы гатовы ва ахвяры. А на з'эканомленыя 115 р. у месяц пабудуем лішні завод. Хто супроць? Адзіналосна.

Таварыш з РСІ устаў, узяў партфэль і заявіў:

— Так вось, я выслухаў вашу думку. На наступным пасяджэньні калегіі РСІ будзе пастаўлена пытаньне аб аб'яднаньні вашых аддзелаў і пададдзелаў, у выніку чаго давядзецца скараціць ня толькі кур'ераў, але галоўным чынам ня менш паловы адказных працаўнікоў, якія прысутнічаюць тут на пасяджэньні. Да пабачэньня.

— Таварыш з РСІ, таварыш... дык мы-ж... ды дырэктыва... ня слухае... пашоў...

На наступны дзень была накіравана папера за подпісам „прода“, у якой паведамлялася ў РСІ, што дзякуючы зробленай за ўчарашні дзень рацыяналізацыі ўстановы, удасца скараціць да 30 проц. штату і скараціць выдаткі на 31,87 проц. У запісы зазначалася, што гэтая рацыяналізацыя была праведзена па ініцыятыве і пры актыўнейшым удзеле ўсіх адказных працаўнікоў установы, прасякнутых шчырым жаданьнем намагчы справе індустрыялізацыі.

П. Б.

Больш увагі пастановам вытворчых нарад.

Гаварыць аб значэньні вытворчых нарад ня прыходзіцца. Іх задача вельмі важная і даказваць гэта, як быццам, і не належыць. У рэзалюцыі 15-га зьезду партыі «аб дырэктывах па складаньні 5-гадовага пляну народнае гаспадаркі» ясна і выразна сказана, што... «зьніжэньне сабекошту зьяўляецца цэнтральнай праблемай прамысловасьці і вырашэньню гэтай праблемы павінны быць падпарадкаваны ўсе іншыя задачы. Галоўным мэтадам яе пасьпяховага вырашэньня павінна зьявіцца сацыялістычная рацыяналізацыя вытворчасьці».

Зразумела, адным, з галоўных дапаможнікаў у гэтым працэсе павінны зьявіцца вытворчыя камісіі і нарады.

Адгэтуль сам сабою выплывае вывад, што гаспадарнікі павінны чула прыслухоўвацца да голасу вытворчых нарад—рабочых мас і рэагаваць на ўсе прапановы рабочых.

Часта, аднак бывае, што той ці іншы гаспадарчы працаўнік, тое ці іншае кіраўніцтва заводу атрымлівае пратакол нарады, і кончана. Бывае нават і так, што гаспадарнікі бяруць удзел у нарадах, не супярэчаць прапановам, якія ўносяцца на нарадах, а ў выніку, атрымаўшы пратакол нарады, не ажыцьцяўляюць гэтых прапаноў рабочых.

За прыкладам ня трэба хадзіць далёка. **Возьмем хоць-бы завод «Энэргія» ў Менску.** Яшчэ 15-га мая вытворчая парада ўхваліла цэлы рад пастаноў. На нарадзе прысутнічала і адміністрацыя. Яна тады не выступала супроць магчымасьці выкананьня прынятых пастаноў. Потым, атрымаўшы паказаныя пастановы вытворчае парады, не паведаміла сваячасова заўком аб затрудненьнях выкананьня гэтых пастаноў і толькі пасьля таго, як заўком стаў дамагацца іх выкананьня, адміністрацыя пачала спасылацца на адсутнасьць сродкаў. І да гэтага часу пастановы нарады не праведзены ў жыцьцё.

Праз 7 з паловаю месяцаў гэтае пытаньне перайшло на абгаварэньне прэзыдыўму ЦП саюзу мэталістых. Прэзыдыў адзначыў нясур'ёзныя адносіны адміністрацыі заводу «Энэргія» да пастаноў вытворчай нарады. Заводзкаму кіраўніцтву запрапанавана ўжыць меры да правядзеньня ў жыцьцё ў бліжэйшы час нявыкананых пастаноў. Прадстаўнік адміністрацыі павінен прысутнічаць на вытворчых нарадах. Адміністрацыя павінна пасьля ўхваленьня пастаноў устанавіць сумесна з заўкомам тэрмін выкананьня іх, а калі немагчыма іх выканаць, тэк ці інакш рэагаваць на іх.

М—ў.

Рабочыя-вынаходцы.

На апошнім пасяджэньні камісіі па рабочым вынаходніцтве быў разгледжаны цэлы рад праектаў рабочых-вынаходцаў.

Асаблівую ўвагу выклікаў эскіз і апісаньне апарату для палліку статыстычных картак, прапанаваны супрацоўнікам ЦСУ Пярловым. Апарат прызнаны вельмі цікавым і арыгінальным па сваёй канструкцыі. Камісіяй пастаноўлена дапамагчы аўтару ў складаньні чэрцяжоў. Пастаноўлена таксама прасіць ЦСУ аказаць аўтару матарʼяльную дапамогу пры канструяваньні маделяй і правядзеньні вопытаў.

Разгледжана таксама апісаньне стэрылізатара для парыкмахэрскіх прыладаў, вынайдзенага парыкмахерам Рамаваўскім. Камісія прызнала прынцып канструкцыі стэрылізатара правільным. Стэрылізатар Раманоўскага добра пабудаваны і цана яго невялікая. Камісія пастанавіла аказаць Раманоўскаму дапамогу пры канструяваньні маделяй. Пастаноўлена таксама прасіць Наркам ахоны здароўя аказаць аўтару матарʼяльную дапамогу ў суме 40 р. для канструяваньня маделі.

Былі разгледжаны акрамя таго праекты электрычнага будзільніка вынаходцы Меламода, эскіз памантна-пяшчанага цыфера гр-на Ласько і эскіз паветранага рухавіка, прапанаванага Жыгальскім. Усе гэтыя вынаходкі прызнаны эканамічна невыгаднымі і нерацыянальнымі.

Дрэнна з мэдыцынай.

(Заходнія чыгункі).

Мэддапамога на вучастку абслугоўвае звыш 800 чал. Аб ролі гэтае дапамогі гаворыць наступныя лічбы: за 10 месяцаў 1927 году прынята хворых 4.800 чал.

Але якасьць гэтае дапамогі застаўляе жадаць лепшага. Асабліва дрэнна наладжана дапамога на маленькіх лінейных станцыях Вярхуціна і Некрашы па Слуцкай ветцы.

Цягнікі там ходзяць тры разы ў тыдзень.

Лякарствы рыхтуюцца ў амбулаторыі, атрымаць іх можна праз 3 дні, іншы раз і праз тыдзень.

Цягнікі стаяць менш 5 хвілін—няма ніякай магчымасьці пабываць у амбуляторыі. Мясцоком і ўрач узьнімалі пытаньне аб больш доўгай астаноўцы цягніка на лінейных станцыях, але нічога ў гэтых адносінах ня зроблена.

Добра абслугоўваецца толькі станцыя Слуцак. Там цягнік стаіць некалькі гадзін, у самым горадзе ёсьць урачы на ўсіх спецыяльнасьцях.

Д.

Напярэдадні сэсіі ЦВК БССР.

Пленум бюджэтнай камісіі.

3-га студзеня а 6 гадз. увечары ў залі пасяджэньняў ЦВК і СНК БССР адчыніўся пленум бэджэтнай камісіі ЦВК.

Пасьля кароткай прамовы Старшыні бюджэтнай камісіі т. Калініна і зацьвярджэньня парадку дня і работы пленуму, слова прадастаўляецца дакладчыку ад СНК тав. Матусу.

Папярэднія даныя Наркамфіну аб выкананьні дзяржбюджэту БССР за 1926-27 бюджэтны год.

(З дакладу т. Матуса).

Бюджэт БССР складаўся з 2-х частак: гадовы бюджэт БССР у межах па 1926-27 г. і потым за 9 м-цаў па б. Гомельшчыне і выявіўся ў суме па прыбытковай частцы—51.168.907 р. і па выдатковай частцы—49.207.294 руб.

Акрамя гэтага выдатковая частка была павялічана на 500.000 руб. за кошт разэрвнага фонду СНК Саюзу па фінансаваньні народнай гаспадаркі па был. Гомельшчыне. Такім чынам фактычна было прызначана да выдачы 49.707.294 руб. і бюджэт быў збалянсаваны з рэшткаю ў 1.961.613 руб. Гэтае перавышэньне прыбыткаў над выдаткамі было абернута на ўтварэньне асобнага рэзэрву Саюзу.

Як ішло выкананьне дзяржбюджэту? У зьвязку з тым, што мы ня маем канчатковага балянсу дзяржбюджэту, ня маем поўных вестак, скажам, няма вестак, колькі мы атрымаем ад Саюзу адлічэньняў ад гэрбавага збору. 6.000.000 р., якія прызначаны да паступленьняў, у лічбы выкананьня бюджэту не ўваходзяць у зьвязку з неправядзеньнем іх па нашым балянсе.

1.961.613 р. на ўтварэньне асобнага рэзэрву Саюзу ССР не ўваходзяць у выдатковую частку. Бяз гэтых лічбаў мы маем паступленьне прыбыткаў у 44.697.541 р. ці 99 проц.; недабору мы маем 1 проц. ці 471.366 р. Па выдатковай частцы мы маем 49.755.859 руб. ці 100 проц., уключаючы 549.064 р. за кошт разэрвнага фонду СНК Саюзу. Калі лічыць, што ад Саюзу мы поўнасьцю атрымаем 6.000.000 р. «адлічэньняў ад гэрбавага збору» і пэўнасьцю перадамо 1.961.613 р. «на ўтварэньне асобнага разэрвнага фонду», то па бюджэце выявіцца дэфіцыт у 470.867 руб.

Калі спыняцца на ўдзельнай вазе асобных выдаткаў па дзяржаўным бюджэце ў гэтым годзе і ў мінулыя гады, то мы павінны будзем адзначыць, што ўдзельная вага па асноўных відах выдаткаў у гэтым годзе павялічылася: на асьвету, навуку і мастацтва з 30,2 проц. да 32,9 проц., гэта значыць на 2,7 проц., па сацыяльным забясьпечаньні—з 5,8 проц. да 6,3 проц., па ахове здароўя—з 7,4 проц. да 8,1 проц., па сельскай гаспадарцы—з 23,8 проц. да 25,8 проц., прычым удзельная вага іншых выдаткаў адміністрацыйна-гаспадарчых значна паменшаецца—на 8,6 проц.

У параўнаньні з мінулым годам мы маем больш плянавасьці, лепшы парадак выдаткаваньня адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў, мы маем таксама значнае паленшаньне падліку маемасьці.

У спрэчках па дакладзе на вечэрнім пасяджэньні выступалі т. т. Паўлюкевіч, Карпешын, Калінін і Патровіч.

Хроніка.

— На 5-ае сьнежня на сэсію зьехалася каля 40 членаў ЦВК. Сярод іх камандзір Ж-скага корпусу тав. Лацыс.

— Атрымана паведамленьне, што на сэсію выяжджае намесьнік народнага камісара асьветы УССР тав. Раппо.

— Сэсія будзе зьнята Белдзяржкіно для чарговай кіно-хронікі.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

па ТЭЛЕГРАФУ, ТЭЛЕФОНУ і ПОШТАЙ ад НАШЫХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ

Беларусізацыя ў Гомельшчыне

(Ад нашага гомельскага карэспандэнта).

У кастрычніку месяцы бягучага году павінны будуць перайсьці на беларускую мову акруговы райвыканком, адміністрацыйны аддзел, акрсуд і іншыя акруговыя ўстановы Гомелю. Саюз савец. і гандлёв. служачых аддае вялікую ўвагу беларусізацыі працаўнікоў акруговых устаноў.

У сучасны момант у Гомелі працуе 8 гурткоў па вывучэньні беларускае мовы. Частка працаўнікоў наведвае беларускую школу. Наогул, каля 300 чалавек узмоцнена займаюцца вывучэньнем беларускае мовы.

Усяго ў Гомелі налічваецца 2.180 членаў саюзу сав. і гандлёв. служачых. Пераважная большасьць з іх працаўнікі прылаўкаў. Шмат хто працуе вечарам. З гэтай прычыны яны амаль цалком пазбаўлены магчымасьці рэгулярна наведваць заняткі гурткоў па вывучэньні беларускае мовы. Для гэткіх працаўнікоў прыдзецца арганізаваць асабовыя гурткі, бо інакш нічога ня выйдзе.

Трэба таксама пасьпяшацца з арганізацыяй гурткоў для працаўнікоў праўленьня працкалектываў «Ларок», страхкасы і дзяржбанку, там ніхто яшчэ не прыступіў да вывучэньня беларускае мовы. Толькі ў страхкасе справа, здаецца, вырашана: мясцком запаўняе, што ў іх гурток будзе арганізован у бліжэйшыя дні.

У раёнах, у сельскіх цэнтрах округі па вывучэньні беларускае мовы працуюць ужо даўно. Саюз ня мае поўных вестак аб працы гэтых гурткоў, але яны, як відаць, працуюць нядрэнна і мясцовыя працаўнікі да кастрычніка бягучага году вывучаць беларускую мову ў выстарчальнай ступені. Але ў гарадзкіх аддзяленьнях міліцыі праца па беларусізацыі зусім не праводзіцца. Ня так даўно акрвыканком даў распараджэньне, каб выдаткі па арганізацыі беларускіх гурткоў узяла на сябе адміністрацыя. Магчыма, што гэта прымусіць падцягнуцца адстаючых.

З другіх недахватаў работы трэба адзначыць, што ў пачатку гурткі ўтвараліся зусім стыхійна, працавалі бяз пляну і кіраваліся часта зусім непрактычнымі працаўнікамі. Цяпер кіраўніцтва беларускімі гурткамі ўзяла на сябе інспэктура акруговага аддзелу народнае асьветы, якая дае ў поўнай меры практычных і ведаючых сваю справу кіраўнікоў.

Была вялікая патрэба ў падручніках. Яшчэ ў 1926 г. была закуплена літаратура, але яна аказалася непадхадзячай. Новыя кнігі прышлося выпісваць з Менску, бо ў «Гомкниге» патрэбнай літаратуры зусім не аказалася.

З-за таго, што літаратуру прышлося даставаць з вялікімі труднасьцямі, з вялікай цяганінай, адбылося затрыманьне ў арганізацыі гурткоў.

А. М.

На другім месцы па падпісцы на пазыку.

Віцебск. (Уласн. кар.) Віцебск заняў другое месца па падпісцы на пазыку індустрыялізацыі. Віцебску прадастаўляецца месца ў тыражнай камісіі. У Маскву паедзе, як відаць, рабочы фанэрнага заводу, які падпісаўся звыш чым на 50 проц. зарплаты.

Справа 12 растратчыкаў.

ВОРША. (Уласн. кар.). Пасьля 4-х дзённага разгляду ў нарсудзе 1-га вучастку вынесен прыгавар па справе растратчыкаў арцянскага працкалектыву.

12 чалавек, знаходзячыся на розных пасадах, пачынаючы ад намесьніка загадчыка працкалектываў і канчаючы прыказчыкам ларка, раскрадвалі грошы працкалектываў і ў выніку гэтага—растрата па ўсіх калектывах вызначылася ў 5.431 р.

Народны суд прыгаварыў намесьніка загадчыка працкалектывамі Бавыкоўскага, загадчыкаў магазынамі Плашчынскага і Іванову да 2-х год зьняволеньня кожнага, астатніх 9 чалавек—да розных тэрмінаў—ад 1 году да 9 месяцаў.

Па амністыі ўсім асуджаным пакараньне зьніжана напалову.

За грамадзкай працай.

СМАЛЯВІЧЫ. (Уласн. кар.). У раёне налічваецца 5 хат-чытальняў і 8 чырвоных куткоў. Загадчыкі чырвоных куткоў ня маюць належнай падрыхтоўкі, таму час та кульгае культасьветная праца. Акрамя таго ў раёне налічваецца 28 розных гурткоў, у тым ліку 3 селькораўскія. Гурткамі ахоплена 615 чал., з якіх 189 жанчын. Налічваецца 86 селькораў, з якіх 48 ахоплена гурткамі, іншыя працуюць паасобку. З выданьнем насьценгазет справа стаіць слаба.

Добраахвотнымі таварыствамі ахоплена: МОПРʼам—336 чал., Асоавіяхімам—556 чал., Чырвоным Крыжам—100 чал. Добра пастаўлена праца ў ячэйках Асоавіяхіму і МОПРʼу.

С. Нортман.

КАЛЮЧЫМ ПЯРОМ.

„ПРАФГРАМАЦЕІ“.

Аднаго рабфакаўца на экзаменах пыталі: што такое прафсаюз, што такое савецкая ўлада? Рабфакавец, пасьля доўгіх разважаньняў, даў адказ: Саветы? Прафсаюзы? Гэта—дыктатура пралетарыяту. Зразумела, што гэты таварыш, які так юрыдычна няправільна ахарактарызаваў два прывадныя рамяні дыктатуры пралетарыяту, на практыцы добра ведае розьніцу паміж імі. Кожны рабочы базумоўна знаёмы з асноўнымі функцыямі прафсаюзаў, з межамі іх кампэтэнцыі.

Абслугоўваць матарʼяльныя і культурныя запатрабаваньні членаў саюзаў, абараняць іх праўныя інтарэсы? Ці павінны гэтым заняцца прафэсыянальныя арганізацыі? Бязумоўна!

А вось назначаць наркомаў, арыштоўваць растратчыкаў, рабіць вобыскі? Наўрад ці знойдзецца хоць-бы адзін рабочы, які-б лічыў гэту працу—абавязкам прафсаюзу. Для таго, каб ведаць падобныя рэчы, нават ня трэба быць знаёмым з асновамі прафэсыянальнай пісьменнасьці.

Ня ведае гэтага **толькі магілеўскае праўленьне саюзу савецкіх і гандлёвых служачых.**

Яно прысвоіла сабе правы выбарчай камісіі ў саветы—орган улады.

На быхаўскім пункце Белдзяржгандлю працуе былы гандляр гр-н Плотнік—член саюзу. Як былы кулак, ён пазбаўлен выбарчых праў і ўзьняў пытаньне аб аднаўленьні ў правах. Праўленьне саюзу пастанавіла: аднавіць гр-на Плотніка ў выбарчых правах (пратакол ад 24-га жніўня 1927 г.).

Вось табе і на! Прыдзецца, як відаць, выбарчай камісіі, скарочанай па штатах, ісьці на біржу працы.

Нізавы прафпрацаўнік, не спакушаны ў тонкасьцях саюзных праў, пытае ў рэдакцыі:

— З якой гэта пары прафсаюзы пачалі аднаўляць гр-н у выбарчых правах? Ці не зьяўляецца гэта ўзурпатарствам?

На апошняе пытаньне нам прыходзіцца даць пацьвярджальны адказ.

Кватэру—тав. дырэктару!

У адзін прыгожы дзень дырэктару Цэнтраземскладу трэба было перамяніць у горадзе кватэру. Нядоўга думаючы, дырэктар загадаў вызваліць памяшканьне канторы Менскага аддзяленьня складу пад кватэру, перавесьці супрацоўнікаў апошняга ў галоўную кантору, і бяз гэтага вельмі перапоўненую (кантора Менскага аддзяленьня і галоўная знаходзяцца ў адным двары, па Савецкай, 47).

Загадана—зроблена. Урэшце дырэктар атрымаў сьветлае, нядаўна абсталяванае памяшканьне.

Цяпер прасочым, што атрымаў другі бок—калектыў супрацоўнікаў складу: першае гэта цесната. Не трычнасьці. Другое—зьмешаны ўсе роды зброі, што надта перашкаджае працы. У адным пакоі і бухгальтэрыя, і машынбюро, і агульная канцылярыя. Стук, гоман і сьпёртае паветра.

Калектыў у цэлым страціў апошнюю надзею мець «Чырвоны куток», каб займацца асьветпрацаю. Бібліятэка знаходзіцца ў калідоры. Пры гэтакім становішчы далёка не заедзеш.

Цэнтраземскладу усё-ж такі выгадаў больш усяго, бо правёў рацыяналізацыю. Хаця год назад ён патраціў на рамонт памяшканьня больш 2.000 рублёў, але трата з цягам часу верноцца, дзякуючы 15 рублям у месяц, якія плаціць р за сваю кватэру...

Нёман

Альлё, гаворыць Менск!

(Ліст з Вільні).

Для радыё няма мяжы!

... Толькі прышарэе вячэрняя гадзіна, [illegible] слухаўкі на вушы і затаіўшы дух кратаем пружынку.

— Чэр! Чэр!—коліцца дэтэктар.

— Чэр-чэр!—ёсьць.

Праз хвіліну-дзьве: «Альлё, альлё, гаворыць Менск».

Зразумела. Голас нашай роднай Савецкай Беларусі. Слухаўкі пераходзяць з рук у рукі.

— «Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся». Слухаем і адзін аднаму пераказваем.

— «Дапаможам падняволеным братом Заходняй Беларусі вызваліцца з-пад панскага прыгону»...

Як блізкі і зразумелы пачуцьцю гэтыя словы. Заб'ецца сэрца адвагаю. Перакінешся з сябрамі «лішнім» словам—ды «ша»!—трэба ведаць меру, час.

Наш аматар, які ловіць і выкідае нам цуда-словы—шэрая скрынчка мае небясьпечную для нас патаемнасьць. Глянеш на гэтую патаемнасьць — кантрольны лістоК пашто[illegible]графнай управы (у [illegible] дэфэнзывы)—рукі ў [illegible] у гэтай патаемна[illegible]стачцы, каго слу[illegible]крый божа! [illegible]перажы божа! [illegible]».

Гэткае рэзюмэ не да смаку прышлося як Вальдэмарасу, так і Пілсудзкаму. Польская прэса змоўчала гэты факт. Толькі адна «Жэч Паспаліта» перадрукавала гэты артыкул з каментарыямі і ганебна сьцьвярджала, што Віленшчына—польскі край, а прэтэнзіі Вальдэмараса на зямлю, дзе «няма ніводнага літоўца—гэта толькі шаленства».

І так, злasьнейшыя ворагі падняволеных народаў, як агэнты Чэмбэрлена, праз маноклі бачаць, што працоўныя імкнуцца ў той бок, дзе яскрава сьвеціць сонца волі, дзе шматлікія народы ў згодзе аднэй сямʼёю будуюць сьветлую будучыну для ўсяго сьвету—сацыялізм.

Гэтыя сымпатыі выяўляюцца ў кожнай праяве жыцьця, у прыватнасьці і ў радыё-аматарстве, аб чым мы хочам ніжэй расказаць.

* * *

Пасьвечаныя ў барацьбу з польскім фашызмам і набочным суседам клясавым ворагам—панам-асаднікам, працоўныя Заходняй Беларусі выкарыстоўваюць усе сродкі і магчымасьці для гэтай барацьбы. Праз сувязь з народамі савецкае зямлі яны набіраюцца большага энтузіязму і рэвалюцыйнага духу.

Адзін з сродкаў сувязі—ёсьць падарунак навукі—радыё.

За мінулы год Заходняя Беларусь зрабіла вялікі крок (ва ўмовах эканамічнай беднасьці і наогул польскіх умовах) наперад у радыёаматарстве. [illegible] что аж паны зава[illegible] дэфэнзыва.

ных радыё-станцый у 1926 годзе заходняя беларуская вёска перасягнула тысячу ўланскіх радыё-прыёмнікаў у 1927 г. Згодна падліку самога польскага тэлеграфнага агэнцтва, на тэрыторыі «Крэсаў Усходніх» налічваецца ўсяго 1730 радыё-ўстановак. Вёска ў значнай меры перагнала горад і слухае...

— Каго-ж яна слухае?—Вось у гэты пытальнік упёрліся паны ідбом. У гэты пытальнік упёрлася вушмі і дэфэнзыва.

— Заходняя Беларусь слухае: Менск, Маскву!

— І толькі Менск, Маскву! Гэта дакавана. У Дзісьненскім павеце дэфэнзыва зрабіла некалькі «аблаў» на вясковых радыё-аматараў і вынік такі: Менск, Масква!

Яшчэ горш у Віленшчыне. У самым горадзе прыватныя начлежныя дамы і піўныя маюць моцныя радыё-ўстаноўкі з гучнагаварыцелямі і што вечар частуюць гасьцей перадачамі Менску і Масквы.

— А чаму? Ды таму, што начлежнікі—сяляне, хочуць слухаць толькі Менск, Маскву.

— Ж-жах! Бальш[illegible] прапаганда. Шукаць ратунку. Рэпрэсіямі не запалохаем. Прадставілі асаднікі ў Варшаву праект на пабудову ў Вільні 10-кілёватнай(!) шырока-вяшчальнай радыё-станцыі, каб «адбіць саветы». Панатужыліся і зм[illegible]травалі шарманку моцна[illegible] кілёват.

У сьн[illegible] польскія [illegible] адчыненьнойскім. Камісія прызнала прынцып канструкцыі стэрылізатара правільным. Стэрылізатар Раманоўскага добра пабудаваны і цана яго невялікая. Камісія пастанавіла аказаць Раманоўскаму дапамогу пры канструяваньні маделяй. Пастаноўлена таксама прасіць Наркам ахоны здароўя аказаць аўтару матарʼяльную дапамогу ў суме 40 р. для канструяваньня маделі.

Былі разгледжаны акрамя таго праекты электрычнага будзільніка вынаходцы Меламода, эскіз памантна-пяшчанага цыфера гр-на Ласько і эскіз паветранага рухавіка, прапанаванага Жыгальскім. Усе гэтыя вынаходкі прызнаны эканамічна невыгаднымі і нерацыянальнымі.

ры газэт, у якіх з натугамі вызначылі «задачы радыё-станцыі».

Першая галоўная задача—барацьба з Менскам.

Як-жа мысьляць паны гэтую барацьбу? На наш погляд, гэта барацьба павінна быць—ідэёвай. А па іхняму выходзіць наадварот і вельмі проста. Для станцыі не патрэбны інжынэры, ёй можа кіраваць найгоршы шарманшчык, які-б толькі ведаў, як пераставіць клямку перадатчыка, каб ён: сьвістаў, шумеў, пішчаў, трашчаў—абы перашкаджаў слухаць другія станцыі. Вось так яно і ёсьць. Віленская станцыя разьмеркавала сваю праграму гадзіна ў гадзіну, як перадае Менск, каб перашкодзіць слухачом прымаць Менск. Але з гэтага малы эфэкт. Віленская станцыя мае сілу кідаць хвалю ў радыусе 30 кілёмэтраў. Перашкаджае яна толькі адным вілянчанам. Гэта паўбяды. Большую бяду для радыё-аматараў прадстаўляе так званы «кантрольны лісток», аб якім мы ўпаміналі раней. Гэта—пуцявіна дэфэнзывы, якая магчыма будзе распраўляцца з радыё-аматарамі—слухачамі Менску, Масквы.

* * *

І так, па ранейшаму вечарэе... Шэрая гадзіна наводзіць сум...

Накінеш слухаўкі на галаву, затоіш дыханьне і сярод шораху, трэску, піску вырываюцца словы: «Альлё, альлё, гаворыць Менск»...

— Гавары палчэй, чырвоны Менск, мы слухаем!

ЯЎХІМ

Вільня 1-I-1

Другі дзень на волі.

15.000 асуджаных.

4 студзеня клюб Леніна Заходніх чырунак быў зерапоўнены рабочымі і служачымі. Былы палітвязьні Польшчы прышлі падзяліцца з рабочымі свабодной краіны аб жыцьці рабочых і сялян у Заходняй Беларусі, Польшчы і аб адносінах да палітвязьняў.

Пад бурныя воплескі член ЦК партыі Заходняй Беларусі тав. Чэрняк пачынае сваю прамову:

— Другі дзень, як я толькі на волі. Мне цяжка падрабязна пазнаёміць вас з палітычнымі абставінамі ў Польшчы. Але вы ўжо не адзін раз чулі і чыталі аб белым тэрары і аб тым, што дзеецца ў Польшчы і Заходняй Беларусі.

Палітвязьняў налічваецца ў Польшчы 6 тыс. чалавек. Гэта няпоўныя весткі. Сюды ня ўваходзяць забастоўшчыкі, дэманстранты і інш. Ёсьць звыш 2 тыс. чалавек, якія засуджаны ад 4-х да 15 год катаргі.

У Віленскай, Беластоцкай і Макатоўскай турмах сядзіць каля 50 проц. сялян, з агульнага ліку засуджаных за ўдзел у барацьбе за камуністычную партыю з буржуазіяй. Прысуджаны яны ад 6 год і да самай сьмерці. Усяго засуджаных набіраецца звыш 15 т. чал.

Жанчына, якая прыехала з намі, прыгаворана да 4-х год катаргі і была зачітана да крымінальнікаў. Яе часта вадзілі на мэдагляд, як быццам прастытутку, і зьдзекаваліся.

— Мяне выводзілі, — кажа т. Чэрняк — з Беластоцкай турмы за ногі, галавой прыходзілася барабаніць на ступенях.

Калі абвяшчалася галадоўка, то сілком кормяць праз нос, або праз задні ход устаўляючы кішку. Б'юць прыкладамі, ключамі і інш.

З прычыны гэткіх зьверстваў да палітвязьняў з боку адміністрацыі турмаў міністр „справядлівасьці" Макоўскі ў 1922 г. выдаў абежнік, у якім быў даны цэлы рад ільгот для палітвязьняў. Але ў Лукіскай турме гэты абежнік быў ведомы для засуджаных у 1926 г., калі палітвязьні пра галадоўку пачалі дамагацца ільгот, як былі даны міністэрствам „справядлівасьці".

7-га лютага ў Беластоку будзе разглядацца справа 133, якіх чакае катарга, а таксама Беларускае Грамады.

Галадоўка ў Беластоцкай турме закончылася сьмерцю двух таварышоў. Беларускіх дэпутатаў: Рака-Міхайлоўскага, Тарашкевіча, Валошына, Мятлу і іншых саслалі ў Ваўроўкі, далей ад радні на асабовым жаданьні міністэрства „справядлівасьці".

Нялаўна ў Луцку адбыўся працэс украінскіх сялян. 9 чалавек засуджаны на ўсё жыцьцё—на катаргу.

У Макатоўскай турме, дзе сядзіць Ланцуцкі, цэлы тыдзень давалі вельмі дрэнны хлеб. Хлеб выкідалі вон, а самі галадалі. Такім чынам кожны месяц памірае 3—4 чал.

Крымінальных выганяюць на прагулку амаль босых (на нагах дошчачкі з раменчыкамі), у той час, калі на дварэ мароз даходзіць да 20 градусаў.

У Ракаве і Львове ў турмах наогул сабачае жыцьцё, каб ня МОПР, то прышлося б разьлічацца з жыцьцём.

Прасядзеўшы 3 -4 г. чалавек дастае раматус, галаўныя хваробы, аслабленьне страўных органаў і інш. З турмы чалавек выходзіць калекай.

За сьвяткаваньне 7-га лістапада ўсіх зьбілі прыкладамі. Адміністрацыя імкнецца, як бы нарушыць тое адзінства, якое ёсьць паміж яўрэямі і беларусамі, то яны робяць так: беларусаў сазяць у адну камэру, а яўрэяў у другую. Адным прысланы хлеб даюць, а другім не. Потым інспэктар, прышоўшы, пытае ў тых, якім не далі хлеба, ці атрымалі яны хлеб. А разам з гэтым паказвае, што нуль яўрэі або беларусы атрымалі.

Кніг для чытаньня нельга дастаць апрача набожных, арытмэтыкі, гэаграфіі і ім падобных.

Можаце сабе ўявіць, што з сябе прадстаўляе белы тэрар.

МОПР усебакова павінен дапамагаць палітвязьням Заходняй Беларусі і Польшчы.

Пад бурныя воплескі закончыў свой даклад т. Чэрняк.

Заслухаўшы інфармацыю палітэмігранта т. Чэрняка аб белым тэрары ў Польшчы і аб палітвязьнях, агульны сход чыгуначнікаў выказвае сваё гарачае спачуваньне і пастанаву адзічыць маўчаньнем заработак у фонд МОПРу.

Рэзалюцыю пастановізі пасцаць палітвязьням, якія сядзяць у Беластоцкай турме.

Ул. Б.

МЕНСК

Т. т. Будзёны, Дыбенка і Ягораў у Менску.

Учора, а 10 гадз. 30 мін. у Менск прыехалі члены РВС СССР, камандуючы БВА тав. Ягораў, інспэктар кавалерыйскіх часьцей Менскага гарнізону з хорам трубачоў.

Члёны РВС учора аб'яжджалі часьці Менскага гарнізону, аглядалі ўмовы разьмеркаваньня часьцей, унутраны парадак у часьцях і пастаноўку навучальных заняткаў.

Члены РВС аглядам засталіся здаволенымі.

Па дарозе з Масквы ў Менск у Барысаве была зроблена трывога часьцям Барысаўскага гарнізону, пасьля сканчэньня якое т.т. Ягораў, Будзёны і Дыбенка дзякавалі часьці за хуткі збор і поўную баявую гатоўнасьць.

т. ЯГОРАЎ.

т. ДЫБЕНКА.

т. БУДЗЁНЫ.

Р.-С. Ч. А. т. Будзёны і начальнік дастаўкі Р.-С. Ч. А. т. Дыбенка.

На вакзале членаў РВС сустракаў камскład кавалерыйскіх часьцей Менскага гарнізону.

За дзень.

КАМАНДЫРОЎКА КААПЭРАЦЫЙНЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ. Беларабскіяя настаўніка камандураваць 12 працаўнікоў рабочай каапэрацыі Беларусі ў Растоў, Харкаў і Тулу для авнаёмленьня з кастаноўкай працы мясных каапэрат маёў.

ПОЛЬСКІ ГАБІНЭТ ПРЫ ПЭДФАКУ. Праўленьне Белдзяржуніверсытэту арганізуе пры педагагічным факультэце польскі габінэт, які будзе абслугоўваць студэнтаў польскай секцыі.

КАРЦІНА „ЕГО ПРЕВОСХОДИТЕЛЬСТВО" ЗА ГРАНІЦАЙ. На гэтых двёх Белдзяржкіно накіроўвае ў Аўстрыю, Чэха-Славакію, Нямеччыну і Латвію 10 фота-камплектаў фільму Белдзяржкіно „Его превосходительство".

РАБОЧАЕ КРЭДЫТАВАНЬНЕ. Белкаапсаюз зрабіў заяўку цэрабсекцыі на 1.600.000 р. на крэдытаваньне рабочай каапэрацыі Беларусі ў другім квартале 1927-28 г.

РАДЫЁ Ў ВЁСЦЫ. Электратэхнічны трэст вядзе перагаворы з Барыўскім акруговым праўленьнем саюзу працаўнікоў зямлі і лесу на ўстаноўку ў вёсках 10 радыё-установак з 4-х лямпавымі прыёмнікамі. Дзьве радыё-ўстаноўкі ўжо адпраўлены ў вёску.

ПАКАЗАЛЬНЫЯ АГНЯТРЫВАЛЫЯ БУДЫНКІ. Белдзяржтэатр у мінулым годзе набудаваў у Слуцку, Лагойску, Гарадку і Бешанковічах паказальныя агнятрывалыя будынкі, на што выдаткавана каля 18.000 р.

АБСЬЛЕДВАНЬНЕ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ. Белрабсекцыя закончыла абсьледваньне грамадзкага харчаваньня ў г. Барысаве. Усяго там працуе 5 сталовак. Большасьць з іх знаходзіцца пры буйных заводах. Белрабсекцыя вамеціла рад мерапрыемстваў па паляпшэньні пастаноўкі грамадзкага харчаваньня ў Барысаве.

БЕЛАРУСКІЯ ЗАПАЛКІ. Згодна праграмы беларускага трэсту завалак у гэтым годзе будзе вымушчана прадукцыі на 1.010. 00 р. Заключан дагавор з Белнайпэлем на рэалізацыю ўсёй запалкавай прадукцыі.

АДНАВІЛА ПРАЦУ ЭКСКУРСІЙНАЕ БЮРО. Пры габінэце палітасьветпрацы (Ракаўская, 2) адновіла сваю працу экскурсійнае бюро.

Спраўкі аб экскурсіях ва ўстановы гор. Менску выдаюцца штодня з 4-х да 8-мі гадзін.

НОВЫЯ ШКОЛЫ. У лютым месяцы будзе скончана набудова 7-годкі на Ляхаўцы. На будаваньне сямігодкі ў Новым Барысаве ў мінулым годзе было патрачана 18.000 руб. У бягучым годзе на гэтую мэту адпушчана каля 35.000 р.

БУДАЎНІЧЫ ФОНД. З прыбыткаў рабочай каапэрацыі Беларусі ў гэтым годзе ўпяршыню выдзяляецца будаўнічы фонд у разьмеры 5 проц. агульнага прыбытку. Фонд будзе выдаткавацца на набудову новых крам і іншых каапэрацыйных устаноў.

ПЕРАВЫБАРЫ КРЭДЫТНЫХ ТАВАРЫСТВАЎ. На 13-м з'езде кредытных таварыстваў Беларусі перавыбары закончыліся. У склад праўленьняў увайшлі 24 беднякі, 19 серадняку, у саветы 45 беднякоў і 39 сераднякоў. У параўваньні з мінулым годам удзел беднякоў у кіруючых органах каапэрацыі значна павялічыўся.

ГІСТАРЫЧНЫ СЛОЎНІК БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ. Інбелкульт вастаніў чацаць выданьне гістарычнага слоўніка беларускае мовы. Слоўнік ахопіць гістарычныя помнікі слова з 13-га на 19 стагодзьдзе. Для напаўненьня слоўніка матар'ялмі сакратар камісіі Воўк-Левановіч выязджае ў Маскву і Ленінград.

Беларускі клюб у Маскве.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам, поўнамоцны прадстаўнік БССР у Маскве тав. Браўковіч паведаміў падрабязнасьці адкрыцьця беларускага клюбу ў Маскве. Клюб адкрыўся на Арбаце, 53. На адкрыцьцё клюбу адпушчана 9.000 руб., з іх 5.000 адпусьціў Наркамасьветы БССР і 2.000 р. Маск. аддз. Нар. Асьветы. Пры клюбе адкрыты літаратурна-мастацкія беларускія гурткі, харавы гурток і інш.

— 75.000 РУБ. СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЙ АКАДЭМІІ. Наркамасьветы адпусьціў 75 т. р. на рамонт будынкаў Горацкай Сельска-Гаспадарчай Акадэміі.

— 7.000 НА ПАЛЕПШАНЬНЕ ДЗІЦЯЧЫХ ДАМОЎ. На апошнім пасяджэньні цэнтральнай дзіцячай камісіі пры ЦВК пастаноўлена адпусьціць 7 т. р. на палепшаньне дзіцячых дамоў.

Злоўжываньні каапэрацыйнымі кніжкамі.

Камісія на рабочым забесьпячэньні пры Наркамфіне БССР пастанавіла пры выяўленьні выпадкаў злоўжываньня кніжкамі, затрымліваць іх і перадаваць праўленьню каапэратыву для прыцягненьня да крымінальнай адказнасьці вінаватых.

Цяпер, як кніжка затрымліваецца на тры месяцы, у другі зусім адбіраецца і на сходзе ўпоўнаважаных ставіцца пытаньне аб выключэньні такое асобы з ліку пайшчыкаў каапэратыву.

ЦРК неабходна разгарнуць шырокую кампанію па растлумачэньні неабходнасьці барацьбы з такімі злоўжываньнямі, антыпрадпісаньнямі бывшчыкаў. Да гэтай справы неабходна прыцягнуць увагу ўсёй каапэрацыйнай і прафсаюзнай грамадзкасьці.

Працаўнікі прыладу, якія будуць на тураць гэтым парушэньням, альбо перадаваць тавары (пайшчыкам ці вінайшчыкам) заведама для перапродажу прыцягваюцца да крымінальнай адказнасьці па 105 і 114 арт. К. К.

Усебеларускі зьезд літоўцаў.

8-га студзеня ў клюбе Менакрывыканкому адкрыецца першы ўсебеларускі зьезд літоўцаў. На зьезд чакаецца 62 делегаты. Апрача таго запрошаны госьці—літоўцы з Ленінграду, Масквы, Харкава, Адэсы. Да зьезду будзе падрыхтавана невялікая выстаўка ўсіх літоўскіх выданьняў у СССР. Для делегатаў зьезду будзе наладжаны канцэрт з удзелам літоўска-латыскага хору. Зьезд працягнецца тры дні.

Здарэньні.

— **Буйная пажара.** Па Шкоцьным завулку, 7, з кватэры І. Ждановіча незадомымі злачынцамі ўкрадзена 100 р. золатам, 100 р. серабром, 70 р. чырвонцамі і на 200 р. розных рэчаў.

— **Затрыманьне злодзея.** Крымінальны вышук затрымаў у Менску злодзея Л. Праўніка, які прыехаў з Гомелю на гастролі. У Менску ён украў у магазыне МЦРК у гр-зі Кірубін 45 р. Грошы знойдзены і вернуты пацярпоўшай.

— **Заезд у поль.** Каля вёскі Веткі, Жлобінскага раёну, знойдзены трупы Е. Бражнікава, Высьветлена, што Бражнікаў замёрз, калі варочаўся дамоў.

— **Панрада.** На Савецкай вул., 80, з кватэры Н. Шчоткі ўкрадзена капілка касы ашчадкасьці з 30-ю руб.

— **Самагубства.** У хвароб 2-е савецкае больніцы, будучы п'яным, павесіўся В. Баўмчэнка—21 г. Блушчэнка—вядомы хуліган і п'яніца.

— **Палкінула дзіцё.** У памяшканьні саюзу савецкіх і гандлёвых служачых знойдзена дзіцё мужчынскага полу—1 г. Устаноўлена, што дзіцё падкінула гр-ка Мішук (Красная вул., 3).

Бібліяграфія.

Аб адным перакладзе.

Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі надрукавала ў перакладзе А. Раманоўскага вельмі распаўсюджаны „Падручнік хэміі" Сазонава і Вярхоўскага. Знадворны выгляд перакладу добры—выразны шрыфт, такія-ж малюнкі, добрая папера.

Але трэба перачытаць толькі дзьвецры старонкі, каб пераканацца, што няўміручы словы байкі Крылова „Беда, коль пироги начнет печи сапожник"... Што гэта так, пераканайцеся самі.

На старонцы 7-й чытаем: „У кавалку граніту можна лёгка пазнаць тры мінэралі: *крамняк, палявік і галын*". Што крыёцца пад гэтымі тэрмінамі, тлумачыцца на стар. 207 і 208: крамняк—„силикат", палявік—„полевой шпат". Тлумачэньне, што такое галын знаходзім на стар. 191. Там надрукавана: галын — $KAl(SO)_2 12H_2O$. Значыць, галын—парасійску квасцы. Пераложым цяпер з беларускае на расійскую мову. Што-ж выйдзе?—«в куске гранита можно легко отличить три минерала: *силикат, полевой шпат и квасцы (!)*» І такая лухта падаецца вучням беларускае школы.

Але пойдзем далей за перакладам... На стар. 40 ён за словам „наі" ў дужках піша „сталы склад". Закон наёў, такім чывам, перакладаецца, як закон „сталага складу". Між тым, у расійскай тэрміналёгіі «закон постоянства состава» (стр. 31) і «закон паев» (стр. 41) зусім розныя законы хэміі. Чаму такая блытаніна? Чаму такая лёгкасьць падыходу да адказнае працы, як пераклад падручніка? Складаецца ўражаньне, што перакладчык выкарыстаў адсутнасьць надрукаванае хэмічнае тэрміналёгіі і падаў страшэнную адсябяціну. Што з таго, што праз яе адным тэрмінам называюцца два-тры розных паняцьці або адна хэмічная матэрыя (вещество) абазначаецца двума - трыма аднолькавымі тэрмінамі. Папера выцярпіць. Прыклады:

1. Галын (квасцы) мае ў перакладзе тры назвы: галун, галын і алун (стар. 43, 60, 190 і 191).

2. «Серная кислота» перакладаецца як „серкавы квас" і як „сярчысты квас" (стар. 52 і 119).

3. «Соли соляной кислоты» на стар. 68 перакладчык называе «хлёранамі», але гэта не мяшае яму, пачаўшы вучыць на стар. 125 новым тэрмінам „хлёрыд", напр. „хлёрыд амону".

4. Крамень у перакладчыка гэта камень, які ўжываецца для крэсіва, і ў той-жа час і хэмічны элемэнт (стар. 166 і 167).

5. Два розных рускіх тэрміны «основность солей» і «валентность» перакладаецца адным словам «вартаснасьць» (ст. 57 і 158).

У кароткай заметцы ня можна зьмясьціць усіх недарэчнасьцяй і грубых памылак, дапушчаных у перакладзе. Але і паданага даволі, каб зрабіць вывод, ці можна раіць пераклад беларускай школе, ці не.

Падручнік па хэміі на беларускай мове вельмі патрэбен нашым тэхнікумам, рабфакам і г. д. „Учебник химии" Сазонава і Вярхоўскага і на вялікае і па абёме кніга добрая. Але пераклад яе А. Раманоўскім з погляду мовы дакам нянісьменны.

Р. Кугель і К. Станкевіч.

Качачка-цацачка. Казка З. Бядулі.

Вышла з друку ў выданьні Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва першая ілюстраваная ў фарбах казка „Качачка-цацачка", прызначаная для дзяцей дашкольнага ўзросту.

Да гэтых часоў падобных беларускіх ілюстраваных дзіцячых казак ніхто не выдаваў, на гэта не зварачалася чамусь ці ніякае ўвагі. Магчыма трэба было выдаваць больш патрэбныя кніжкі, як падручнікі ці мастацкую літаратуру, якімі трэба было забясьпечыць у першую чаргу школу, што перайшла на родную мову навучаньня. Тым ня менш па дзіцячую кніжку ў нас таксама вялікі голад, беларускі рынак да гэтага часу зусім ня меў дзіцячай літаратуры і прыходзілася карыстацца расійскімі ды часамі польскімі кніжкамі, якія часамі дзецям і на зусім зразумелы.

Дзяржаўнае Выдавецтва начыстае мастацкае разумець пераважальнасьць адсутнасьці на рынку дзіцячае літаратуры, у выніку чаго мы маем першую спробу ў гэтым напрамку, выхад у сьвет выдомай ужо казачкі З. Бядулі „Качачка-цацачка", чаго, зразумела, нельга не вітаць.

Апрача гэтага трэба зазначыць, што шрыфт у казцы трэба было даць буйнейшы, дый паперу, мусіць, на шкодзіла-б даць грубейшую. Але ўсё гэта для першае спробы невялікіх загашм. Трэба думаць, што гэта кніжка не выпадковая, што Белдзяржвыдавецтва і надалей будзе выдаваць дзіцячую літаратуру, а набываючы практыку ў гэтай галіне, будзе вылапцца і якасьць кніжак.

Дадзеная кніжка лепшае сабе чытаць, бо беларускі дашкольнік, ды нават і школьнік нізэйшага ўзросту, даўно ня чытае.

ТЭАТР.

Белдзяржтэатр у Віцебшчыне.

(Ад нашага віцебскага карэспандэнта).

Апасеньні, што выказваліся да прыезду першага Белдзяржтэатру ў Віцебск, што тэатр ня будзе мець посьпеху ў рабочага глядача, аказаліся вазбаўленьні ўсякага грунту. Цяпер ужо можна падасьці некаторыя вынікі яго працы на Віцебшчыне.

Ня кажучы аб матар'яльным посьпеху (сьнежань месяц даў у середнім 280 р. на круг, што зьяўляецца ў віцебскіх умовах рэкордным лічбай для любой другой трупы, даючы 2-3 новыя п'есы ў тыдзень), тэатр цалком завяваў і арганізаваў вакол сябе рабочую аўдыторыю. Яму ня прыходзіцца чакаць публікі ў касы. Білеты амаль на ўсе спэктаклі закупляюцца акруговым саветам прафэсіянальных саюзаў, саюзам саўгандслужачых, мэталістамі, школамі, камсамолам.

Асабліва каштоўны новы комплет продажу спэктакляў для Чырвонай армії. Гэты комплет мае вялікае значэньне, як фактар укараненьня беларускай культуры ня толькі ў асяродку рабочай масы, але і ў асяродках Чырвонай армії.

Але гэтым не абмяжоўваецца праца тэатру. Апошні ўжо два разы выязджаў у рабочы раён—Мар'янаўчыну, дзе з вялізарным посьпехам выступаў на сваёй буйной у Віцебшчыне фабрыцы „Дзьвіна". У бліжэйшыя дні тэатр пакажа чыгуначнікам.

Чаму гэтак пасьпяхае тэатр?

Усе яго выступленьні, як кажучы аб дакладнасьці адзелкі, сугучны і зразумелы рабочаму глядачу. Такія п'есы як „Кастусь Каліноўскі", „Каваль Вашэда", або новая пастаноўка „Мокся" ішлі дваццаці разы з незмяннымі посьпехам збіраючы да двухнага часу ка 400-500 чалавек глядачоў.

4-га сьнежня адбыўся вялікі канцэрт, які ў значнай ступені абкрыўся ў яго ад тэатру, з боку рабочага глядача, рабкораў і рабочага актыву.

Я.

Адказны рэдактар Ял АСЬЛОЎ

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр. ПЯТНІЦА. 6 СТУДЗЕНЯ „У МІНУЛЫ ЧАС", народная трагедыя у 4 дзеях. Пачатак а 8 з палов. гадзіне

Кіно-тэатр „Культура" Сучасная драма „ЖЕНА", у 6-ці част. Звыш прагр. РЫЧАРД ТОЛМЭДЖ у камэдыі „ЛОВКИЕ ДЕЛЬЦЫ", у 6-ці част.

Кіно „Чырвоная Зорка". Новая замежная пастаноўка „ГОЛУБАЯ КРОВЬ", мист.-псыхал. драма у 6 ч. АНОНС! НАСТУПНАЯ ПАСТАНОЎКА „ВЕЧНАЯ БОРЬБА".

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ" „ВАША ЗНАКОМАЯ", сучасная бытавая драма у 6 часьцях.

Кіно „Інтэрнацыянал". 3-я АПОШНЯЯ СЭРЫЯ 3-я „КЛЕЙМО ПРЕСТУПЛЕНИЯ". Трэка-арыялюч. кіно-рама у 8 частках.

Гэтымі днямі выходзіць з друку новая кніга „ЗАПАДНАЯ БЕЛОРУССИЯ". Книга I. Стран. 210. БГИ. Цена 2 руб.
СОДЕРЖАНИЕ:
А. И. ЦВИКЕВИЧ.—Политический очерк Западной Белоруссии.
Проф. В. ПИЧЕТА.—Исторические судьбы Западной Белоруссии.
1. Колонизация территории.
2. История территории Западной Белоруссии.
3. Экономическое развитие Западной Белоруссии.
4. Классовая структура общества.
5. Организация управления.
6. Просвещение. Школа. Церковь.
7. Революционное движение в Западной Белоруссии.
А. СМОЛИЧ.—Географический и топографический очерк Западной Белоруссии.
1. Положение и границы.
2. Природа Западной Белоруссии.
3. Топографический обзор Западной Белоруссии.
А. СМОЛИЧ.—Население Западной Белоруссии, его национальный и профессиональный состав.
М. АЗБУКИН.—Населенные местности Западной Белоруссии.
Б. ВОЖОВСКИЙ.—Политические партии Польши и Западной Белоруссии.
Кроме черных карт и диаграм в тексте, в книге имеется две многокрасочные карты: 1. Гипсометрическая карта Зап. Белоруссии (5 красок) и 2. Политическая карта Польши и Белоруссии с указанием этнографических, исторических границ и линий Керзона, Дмовского и др. (6 красок).
Заказы прымаюцца: Менск, Савецкая, 63, гандлёвы аддзел Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва, а таксама ва ўсіх аддзяленьнях БДВ. 447

ЗАОЧНЫЕ ПРОМЫШЛЕННО-ЭКОНОМИЧЕСКИЕ КУРСЫ „ПОЛИГЛОТ" (Основ. в 1917 г.) состоящие в ведении С.-Н. Крайкома.
ПРЕДМЕТЫ ПРЕПОДАВАНИЯ:
бухгалтерия, коммерческ. вычисл., торг. корреспонд., делопроизводство, изправление почерка, техн.-худож. черчение, машиностроительное черчение, рисование, стенография и конкурчет [дефинитиф].
Занятия посредством переписки по почте специально составленными лекциями, ВПОЛНЕ ЗАМЕНЯЮЩИМИ УСТНОЕ ПРЕПОДАВАНИЕ. По окончании курса учащиеся подвергаются испытанию в специальн. комиссии и получают соответственное СВИДЕТЕЛЬСТВО.
На 1-е ноября 1927 г. на курсах состоит свыше 15.000 учащихся.
Плата помесячно от 1 до 3 рублей.
Требуйте бесплатно проспекты, программы и условия.
Адрес: Ростов на Дону „ПОЛИГЛОТ".

ОБ'ЯВЛЕНИЕ
Спирто-водочный завод ЦЕНТРОСПИРТА назначает ТОРГИ
на перевозку вина в пределах г. Минска сроком на 1 год.
Торги состоятся 7 января 1928 г. в 10 час. дня в помещении конторы завода (2-я Лекерта, 15).
Желающие принять участие в торгах должны предварительно внести в кассу завода 500 руб. За всеми справками обращаться в контору завода ежедневно с 10 до 12 часов.
40.

ПОСПЕШИТЕ ПОДПИСАТЬСЯ НА ПЕРИОДИЧЕСКИЕ ИЗДАНИЯ ИЗДАТЕЛЬСТВА
„РАБОТНИК ПРОСВЕЩЕНИЯ".
Срок подписки с участием в розыгрыше 500 премий продлен до 31 января.

Условия подписки:

	Год.	6 мес.	3 мес.	Допуск рассрочки. При подп.	К 1/IV	К 1/VI	К 1/X
	Р.К.	Р.К.	Р.К.	Р.К.	Р.К.	Р.К.	
Учительская Газета, еженед. орг. ЦК союза раб. просвещ. СССР—без приложений	3.—	1.75	1.—	1.50	1.50	—	—
Учительская Газета, » » » » » » » с одним прил. (12 кн.)	5.—	3.—	1.75	3.—	2.—	—	—
Учительская Газета, » » » » » » » с двумя прил. (24 кн.)	7.—	4.—	2.25	4.—	3.—	—	—
Народный Учитель, ежемес. журн. » » » » » без приложений	5.—	3.—	1.75	2.—	2.—	1.—	—
Народный Учитель, » » » » » » » с одним прил. (12 кн.)	8.—	4.50	2.50	4.—	2.—	2.—	—
Народный Учитель, » » » » » » » с двумя прил. (24 кн.)	11—	6.—	3.25	5.—	3.—	3.—	—
Народный Учитель, » » » » » » » с тремя прил. (36 кн.)	14—	7.50	4.—	6.—	4.—	4.—	—
Народный Учитель, » » » » » » » с 4-мя прил. (48 кн.)	16—	8.50	4.50	7.—	5.—	4.—	—
Работник Просвещения, двухнед., орг. ЦК союза работн. просвещ. СССР—без прил.	5.—	3.—	1.75	2.—	2.—	1.—	—
Работник Просвещения, с прил. (12 №№) «Листок Технического Служащего»	6.—	3.50	2.—	3.—	2.—	1.—	—
Листок Технич. Служащего, ежемес. прилож. к журн. «Работн. Просвещ.»	1.—	—60	—	—40	—60	—	—
Научный Работник, ежемес. орган ЦС секции научных работников	10—	5.50	3.—	4.—	3.—	3.—	—
На путях к новой школе, ежемесячн. орган научно-педагогической секции ГУС'а	6.50	3.50	2.—	3.—	2.—	1.50	—
Вестник Просвещения, ежемес. орган Московского Отдела Народного Образования	7.—	4.—	2.50	3.—	2.—	2.—	—
Педагогические курсы на дому (выходят в об'еме 100 печатн. листов в год)	10—	—	—	3.—	3.—	2.—	2.
Родной язык и литература в трудовой школе, методический журнал Главсоцвоса РСФСР, 5 книг в год	7.—	—	—	3.—	2.—	2.—	—
Обществоведение в трудовой школе, методич. журн. Главсоцвоса РСФСР, 5 кн. в год	7.—	—	—	3.—	2.—	2.—	—
Естествознание в трудовой школе, методич. журнал Главсоцвоса РСФСР, 5 кн. в год	7.—	—	—	3.—	2.—	2.—	—
Физика и математика в трудовой школе, методический журнал Главсоцвоса РСФСР, 5 книг в год	7.—	—	—	3.—	2.—	2.—	—
Читальня советской школы, серия книг для внешкольн. чтения учащихся школ I ступени	8.—	—	—	3.—	3.—	2.—	—
Педагогическая Энциклопедия в 3-х больших томах	18—	при подп. 3 руб., сем. пят. плат.					
Готовься в ВУЗ, пособие по подготовке в высшие учебные заведения, 6 кн.	11—	» » 3 » » » »					
Наука и техника СССР за 10 лет, в 3-х больших томах с иллюстрац. в переплетах	20—	» » 5 » » » »					

Среди годовых подписчиков на периодические издания, подписавшихся и внесших полностью годовую подписную плату до 31 января,
500 ПРЕМИЙ. ПРОИЗВОДИТСЯ РОЗЫГРЫШ ПРЕМИЙ 500 ПРЕМИЙ.

В. И. ЛЕНИН—Полное собрание сочинений. 3-е издание, 25 томов. Издание института Ленина. 10 комплектов.
М. ГОРЬКИЙ—Полное собрание сочинений. 18 томов. 10 комплектов.
Л. Н. ТОЛСТОЙ—Собрание сочинений. 24 тома. 20 комплектов.
Ф. М. ДОСТОЕВСКИЙ—Собрание сочинений. 12 томов. 5 компл.
ДЖОН РИД—Десять дней, которые потрясли мир. С предисловием В. И. ЛЕНИНА. В хорошем переплете с золотым тиснением. 100 экземпл.
ЛИТ.-ХУДОЖЕСТВ. БИБЛИОТЕКИ из пяти книг в каждой: Ф. Гладков.—Цемент. А. Яковлев.—Октябрь. А. Неверов.—Ташкент, город хлебный. А. Фадеев.—Разгром. Г. Семенов.—Наталия Тарпова. 100 компл.
БИБЛИОТЕКИ ПО КАТАЛОГУ ИЗДАТЕЛЬСТВА стоимостью в 10 руб. каждая. 120 комплектов.
ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ЭНЦИКЛОПЕДИЯ. 3 больших тома. В изящных переплетах с золотым тиснением. 25 комплектов.
НАУКА И ТЕХНИКА СССР ЗА 10 ЛЕТ. 3 больших тома с иллюстрациями и в переплетах. 22 комплекта.
ВЛАСТЬ СОВЕТОВ ЗА 10 ЛЕТ. Художественный альбом. 30 экз.
ОБЛИГАЦИИ ЗАЙМА ИНДУСТРИАЛИЗАЦИИ. 50 штук.
ВЕЛОСИПЕДЫ. 3 штуки.
ТАЛОНЫ НА ЭКСКУРСИИ ПО КАВКАЗУ ИЛИ КРЫМУ (по выбору) с полным содерж. и проездом 5 талонов.

В РОЗЫГРЫШЕ 500 ПРЕМИЙ принимают участие подписчики период. изданий: „Учительская Газета", „Народный Учитель", „Работник Просвещения", „На путях к новой школе", „Вестник Просвещения", „Педагогические курсы на дому", „Научный Работник", „Родной язык и литература в трудовой школе", „Обществоведение в трудовой школе", „Физика и математика в трудовой школе", „Естествознание в трудовой школе".
Подписчики нескольких периодических изданий, организации и коллективные подписчики участвуют в розыгрыше премий по каждому изданию отдельно.
Розыгрыш премий будет произведен по спискам в присутствии представителей союзных организаций союза работников просвещения и подписчиков.
Фамиліи выигравших будут об'явлены в «Учительской Газете».
Годовые подписчики, сделавшие подписку в кредит и подписавшиеся в рассрочку, в розыгрыше премий не участвуют.
Заказы и денежные взносы направлять по адресу: Москва, 19, Воздвиженка, 10, из-ву «Работник Просвещения».
Подписка принимается также в отделениях и магазинах изд-ва: в Ленинграде—ул. Плеханова, 8-10, в Харькове—Шляпный пер., 2, а также во всех почтовых предприятиях СССР.

ПРОДАЕТСЯ токарный СТАНОК САМОТОЧКА МЕТРОВКА. Менск, Советская, 56, слесарная мастерская. 443

ПРАДАЕЦЦА ЗРЫУ-ПАПЕРА, макулатура і старыя газэты — Цана зьніжана — Зварочвацца ў галоўную канцэлярыю газ. «Зьвязда». Савецкая, 63, 3-ці паверх.

Згубленыя і ўкрадзеныя наступныя дакуманты лічыць несапраўднымі:
Дамрыжыўная картка Шымен Я. М., выд. Заслаўскім РВК. 1219.
Кватэр. кн. Розаева Х. М., выд. МЦРК. 1212.
Дашнерт Фрэнкеля М. А., выд. б. ваенчанскай управай 1219.
Сяброўская кн. Веск Б. Н., выд. самаім працаньетва 1215.
Сяброўск. кн. Сьвідзерскага А. І., выд. самаім рабкомасам 1216.
Сяброўск. кн. Волжскай-Юрыцкай Ф. У., выд. самаім рабіс. 1217.
Кватэр. кн. Лурье Л. І., выд. МЦРК. 1218.
Кватэрн. кн. Смуратовіча І. А., выд. МЦРК. 1219.
Кватэрн. кн. Кабрэна Я. С., выд. МЦРК. 1220.
Кавенная картка Шупейко Ф. С., выд. Самахвазавіцкім РВК. 1221.
Беспрацоўная кн. Падалак В. П., выд. Менстрахкасай. 1222.
Правіз. білет. Храповіча К. І., выд. канторай МБВ чыг. 1223.
Кватэрн. кн. Горцовіча Х. Л., выд. МЦРК. 1224.
Асабов. пасьведчаньне Горцовіча Х. Л., выд. Менакрвіканкомам. 1225.
Кавенная картка Азановіча І. К. выд. б. беларускім с.-с. 1226.
Справка аб працы Ганчаронка К. М., выд. цагальнай Гандл.-Буд. Трэсту. 1227.
Справка аб працы Васілеўскай Н. М. выд. насьцісным катэхіз. працаўніц. 1228.
Кошт публікацыі аб згубе аднаго дакумэнту 50 кап.
Стоимость об'явления о расторжении брака или перемене фамилии
Стоимость об'явл. ищущих труда.

Друкарня газэты «Зьвязда»